СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*IV квартал*
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ВЕРАСНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 176
(26784)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСКУЮ МОВУ НАЗВАЛІ РОДНАЙ 60 ПРАЦЭНТАЎ ЖЫХАРОЎ РЭСПУБЛІКІ

Беларускую мову назвалі роднай 60 працэнтаў жыхароў рэспублікі, аднак звычайна размаўляюць на ёй дома толькі 30 працэнтаў насельніцтва. Аб гэтым паведаміла намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кухарэвіч на прэс-канферэнцыі па выніках перапісу насельніцтва 2009 года, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Асноўнай мовай, якая выкарыстоўваецца для стасункаў, з'яўляецца руская мова. На ёй звычайна размаўляюць дома амаль 6 млн 673 тыс. чалавек — 70 працэнтаў жыхароў краіны. А беларускую мову выкарыстоўваюць 2 млн 227 тыс. чалавек.

Алена Кухарэвіч падкрэсліла, што ў Беларусі ўзрастае колькасць і доля насельніцтва, якое свабодна валодае замежнымі мовамі. Напрыклад, 450 тыс. чалавек свабодна валодаюць англійскай мовай (у параўнанні з данымі перапісу 1999 года іх стала ў 3,2 раза больш). Амаль 138 тыс. чалавек свабодна валодаюць нямецкай мовай, што ў 2,2 раза больш, чым было ўлічана пры перапісе насельніцтва 1999 года.

На тэрыторыі Беларусі пастаянна пражываюць прадстаўнікі 140 нацыянальнасцяў і народнасцяў.

Амаль 84 працэнты жыхароў краіны аднеслі сябе да карэннай нацыянальнасці — беларусаў, 8 працэнтаў — да рускіх, 3 працэнты — да палякаў, каля 2 працэнтаў — да ўкраінцаў, 0,1 працэнта — да яўрэяў. Прадстаўнік Белстата падкрэсліла, што нацыянальны склад асобных абласцей нашай краіны адрозніваецца ад рэспубліканскага. Так, у Брэсцкай і Мінскай абласцях пяцёрку найбольш шматлікіх нацыянальнасцяў замыкаюць не яўрэі, а армяне. У Гомельскай вобласці на чацвёртай пазіцыі ў спісе найбольш шматлікіх нацыянальнасцяў знаходзяцца цыгане, а палякі перамясціліся на шостую пазіцыю. У Гродзенскай вобласці доля беларусаў складае 67 працэнтаў, палякаў — 22 працэнты, а замыкаюць пяцёрку літоўцы з доляй 0,2 працэнта.

Абсалютная колькасць прадстаўнікоў найбольш шматлікіх нацыянальнасцяў у Беларусі скарацілася ў параўнанні з данымі перапісу 1999 года: яўрэяў — у 2,2 раза, украінцаў і рускіх — на трэць. Змяншэнне колькасці прадстаўнікоў асноўных нацыянальнасцяў Алена Кухарэвіч растлумачыла як натуральнай стратай насельніцтва, так і міграцыйным адтокам.

Пры гэтым міграцыйныя працэсы прывялі да росту колькасці прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Так, у параўнанні з 1999 годам колькасць кітайцаў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, вырасла больш як у 20 разоў, арабаў — у 2,7 раза, туркменаў — у 2,3 раза. Разам з тым доля прадстаўнікоў гэтых нацыянальнасцяў у агульнай колькасці насельніцтва нашай краіны пакуль нязначная.

Сярод самых рэдкіх нацыянальнасцяў у Беларусі — японцы (23 чалавекі), шведы (17), а 1 чалавек назваў сябе сібірскім татарынам.

На момант перапісу насельніцтва ў кастрычніку 2009 года на 1000 жыхароў краіны ў працаздольным узросце прыпадала 624 чалавекі ў непрацаздольным узросце. Для параўнання: паводле даных перапісу 1970 года — 894 чалавекі, 1979 года — 718, 1989 года — 786 і 1999 года — 746 чалавек.

СТАР. 2

ПАТРЫМАНЫЯ ІНШАМАРКІ Ў БЕЛАРУСІ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАТАННЕЮЦЬ

Цэны на патрыманыя аўтамабілі ў Беларусі ўпадуць яшчэ больш. Такую думку выказала **генеральны дырэктар Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Людміла ШАБАНАВА**.

«Прапанаванне за апошні час не зменшылася, а попыт застаецца дастаткова слабым, прычым як на патрыманыя, так і на новыя аўтамабілі, — сказала яна. — А калі прапанаванне перавышае попыт, то цэны, зразумела, падаюць».

Акрамя таго, аказваюць дадатковы націск на рынак патрыманых аўтамабіляў умовы бяспошліннага ўвозу іншамарак з Беларусі ў Расію. Згодна з імі, не падлягаюць мытнаму дэкларыванню толькі аўтамабілі, увезеныя ў Беларусь фізічнымі асобамі да 1 студзеня 2010 года. У гэтым выпадку яны маюць статус тавараў Мытнага саюза. Пры гэтым, каб прадаць аўтамабіль у Расіі, неабходна таксама атрымаць пашпарт транспартнага сродку, а ён выдаецца толькі тым аўтамабілям, якія адпавядаюць экалагічнаму класу Еўра-4 і Еўра-5. Таму іншаркі, якія не падпадаюць пад гэтыя катэгорыі, застануцца ў Беларусі. «Расія спрабуе не дапусціць увозу на сваю тэрыторыю патрыманых аўтамабіляў для перапродажу», — растлумачыла прадстаўнік асацыяцыі.

Улічваючы, што толькі за апошнія паўгода фізічныя асобы завезлі ў Беларусь больш як 110 тыс. аўтамабіляў, рынак патрыманых аўтамабіляў сёння перапоўнены. Усё гэта акажа ўплыў на цэны.

У той жа час нейкага катастрафічнага падзення на рынку не адбудзецца, паколькі ва ўрон сабе прадаваць будуць толькі тыя, каму трэба разлічвацца па крэдытах. «Але гэта пакуль прыватныя выпадкі, а не агульнапрынятая практыка», — сказала Людміла Шабанава.

Еўрапейскі экалагічны стандарт Еўра-4 быў уведзены ў 2005 годзе. Аўтамабілі, якія выкарыстоўваюць рухавікі гэтага класа, працуюць на бензіне Аі-92 і вышэй, у той час як машыны, якія падтрымліваюць стандарт Еўра-3, выкарыстоўваюць паліва Аі-76 і вышэй. Цяпер усе сусветныя вытворцы збіраюць аўтамабілі, адпаведныя стандарту Еўра-4. Аднак далёка не ўсе беларусы набываюць за мяжой новыя аўтамабілі: большасць увезеных фізічнымі асобамі транспартных сродкаў адпавядае класу Еўра-3.

БЕЛТА.



Жывая зямля

АРЛОВА І АРЛЫ

— Хоць і жывуць у няволі, адчуваецца, што гэтыя птахі заўсёды застаюцца няскоранымі, сапраўды з пачуццём уласнага гонару, — кажа **Ірына АРЛОВА — ветэрынар і заолаг Віцебскага заапарка**. Пра жывёл і птушак, і не толькі арліных, яна можа расказваць бясконца, таму што ведае лёс кожнага свайго пітомца. Па розных прычынах трапляюць яны ў клетку.

— У клетку, але не ў няволю. Таму што на волі іх некалі чакала непазбежная пагібель, — удакладняе Ірына і акцэнтуе ўвагу на той факт, што ўсе птушкі былі падабраныя не проста ўважлівымі — неабыякавымі да жывой прыроды людзьмі. Віцебскі заапарк — тэрыторыя сапраўднага чалавечага высакародства. Не без гонару падкрэслівае: «Наш заапарк адзіны, які збірае параненых, хворых і знясіленых птушак. Потым выходжвае і, калі ёсць упэўненасць у іх выздараўленні, выпускае на волю».

Спачатку мы падышлі да клеткі з яструбам-асаедам, і Ірына распавяла ўласную гісторыю выходжвання гэтага драпежніка. «Птушку злавілі будаўнікі і прапаноўвалі яе арнітолагам за грошы, напэўна, хацелі зарабіць на гарэлку. Арнітолагі перадалі мне. Трэба было неяк выкарміць і захаваць птушаня».

Тры гады асаед жыў у кватэры Ірыны, цалкам разумеючы, што яму дазволена рабіць. Ён ведаў сваю тэрыторыю, а спажываў усё, чым сталаваліся гаспадары — ёгурты, тварог, мёд, хоць на волі галоўным спажывам асаеда з'яўляюцца лічынкі восаў, пчол, шмялёў і шэршняў. Ірына ўсяляк імкнулася не дапусціць, каб птушка стала ручною. Як правіла, асаед на зіму адлятае. Але адпусціць яго яна не рызыкнула, каб не загінуў. Цяпер асаед знаходзіцца ў адной клетцы з канюком, якога дзве зімы таму падабралі і прынеслі таксама жыхары Віцебска.

Васямнаццаць гадоў жыве ў заапарку арлан-белахвост, знойдзены вядомым арнітолагам Уладзімірам Іваноўскім зімою ў сумёце. Сёння па знешнім выглядзе ніяк не скажаш, што бедалагу літаральна вярнулі з іншага свету. Статная, сытая, здаровая птушка, і прастора клеткі-вальера яе цалкам задавальняе. Арол ведае сваіх апекуноў, і, калі ветэрынар Арлова заходзіць у клетку, птушка ў знак згоды дазваляе да сябе наблізіцца.

Восень кліча ў вырай. Але буслы, лебедзі, гусі і чайка ў неба не імкнуцца. Яны разгульваюць па ўсёй тэрыторыі, дакладна ведаючы, што з 16 да 17 у іх час вячэры. Ціхутка, не варушачыся, сядзяць на шастках балотныя і вушастыя совы — ажно сем штук.

— У нас адна з найбольшых калекцый драпежных птушак сярод беларускіх заапаркаў, — кажа Ірына Арлова, — хоць толькі мы на гаспадарскім разліку і маем зусім невялікія грошы для існавання. Ад горада ж не атрымліваем ніякай датацыі.

І яна ніколькі не перабольшвае, калі называе заапарк адзіным у краіне рэабілітацыйным цэнтрам для дзікіх птушак. У тым ліку і чырванакніжных.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает об изменении с 10 сентября 2010 года процентных ставок по договорам срочного банковского вклада (депозита)

«ВРЕМЯ ДЕНЕГ!»

С 10 сентября 2010 года размер процентных ставок по вновь заключаемым договорам срочного банковского вклада (депозита) «Время денег!» составит:

Период хранения	Для вкладов в, % годовых		
	белорусских рублях[1]	долларах США и евро	российских рублях[2]
с 1 по 95 день	14,5	4	7
с 96 по 190 день	15,5	6	9
с 191 по 285 день	16,5	8	11
с 286 по 380 день	17,5	9	13

[1] К договорам срочного банковского вклада (депозита), заключенным до 10.09.2010, данный размер процентных ставок применяется с 10.10.2010.

[2] К договорам срочного банковского вклада (депозита), заключенным до 16.08.2010, данный размер процентных ставок применяется с 10.10.2010.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

ЗАГІНУЛІ З-ЗА ЎЦЕЧКІ ГАЗУ

Мужчына і жанчына загінулі ў доме з-за ўцечкі газу з газавага балона. Дом літаральна склаўся, як картачны. Трагедыя адбылася днём у вёсцы Лескавічы Шумілінскага раёна.

Як паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**, калі выратавальнікі пасля сігналу аб пажары прыбылі на месца здарэння, адбыўся выбух газавага балона, асколкі якога разляцеліся нават на суседнія участкі.

Як высветлілася, у доме пражывала 58-гадовая жанчына, да якой сын прыехаў у госці. Яны дапамаглі аднасяльчанам убраць бульбу. Потым разам з суседзямі пачалі распіваць атрыманы за дапамогу «ганарар» — дзве бутэлькі гарэлкі. У выніку сын гаспадыні дома і суседка заснулі, сусед пайшоў па сваіх справах, а гаспадыня вырашыла зварыць бульбу.

Так выйшла, што ў гэты ж дзень спецыялісты газавай службы замянялі газавы балон, але па нейкай прычыне не ўстанавілі яго, як патрабуецца. І сын сам далучыў балон да газавай пліты. Гаспадыня дома, перад тым, як уключыць пліту, пры дапамозе запалкі вырашыла праверыць, ці няма ўцечкі газу. У гэты момант газ у паветры ўспыхнуў, пачаўся пажар. Крыкі жанчыны пачуў сусед і дапамог ёй выбрацца з дома. Цела яе сына выратавальнікі знайшлі ля ўваходных дзвярэй. Відаць, ён прачнуўся і спрабаваў выйсці на вуліцу, але з-за разбурэння дома не здолеў, а цела суседкі ляжала на ложку.

Нельга самастойна падключаць газавае абсталяванне — гэтыя заклікі пажарных і газавікоў пацвярджаюцца чарговай трагедыяй.

ПЕРАЕХАЎ ГРУЗАВІКОМ ЧАЛАВЕКА, ПАЕХАЎ ДАЛЕЙ

У Глыбоцкім раёне ля вёскі Квачы а дванаццатай гадзіне ночы «МАЗ» на дарозе Полацк — Глыбокае — мяжа Літвы наехаў на чалавека, які ляжаў на дарозе: 44-гадовы мужчына памёр ад атрыманых траўмаў. Вадзіцель грузавіка пакінуў месца дарожна-транспартнага здарэння.

Але яго хутка знайшлі міліцыянеры. Высветлілася, што за рулём грузавой машыны быў жыхар Ушацкага раёна. А вось чаму чалавек ляжаў на дарозе — высвятляецца. На жаль, святлоадбівальны элемент не выратаваў яго ад наезду. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗБІЎ ПРЫЧЭПАМ ПАДВОДУ

Трагедыя ва ўрочышчы «Дубовы Рог» ля вёскі Лядзец Столінскага раёна адбылася вечарам. І хоць на падводзе былі святлоадбівальныя элементы, трактарыст яе не заўважыў і зачапіў прычэпам МТЗ-82. 20-гадовы кіроўца воза, пастух мясцовага СВК, загінуў на месцы, а яго пасажыр з цяжкімі траўмамі дастаўлены ў бальніцу.

Яна СВЕТАВА.

Ад прадзедаў...

«ЦМОК ПАЛЯЦЕЎ!», альбо Зорнае неба вачамі старажытных беларусаў

У адрозненне ад сваіх сённяшніх спадчыннікаў, старажытныя людзі былі значна бліжэй да прыроды, адчувалі сябе яе арганічнай часткай. Увесь навакольны свет продкі напаўнялі міфічным зместам, казачнымі жывымі істотамі. Асобнае месца ў міфалагічным уяўленні беларусаў займалі астранамічныя аб'екты, бачныя няўзброеным вокам.

Чорная Баба на «мятле»

— Тое, што людзі не маглі зразумець, патлумачыць рацыянальна, яны тлумачылі з дапамогай міфалагічных вобразаў, — расказаў **магістр гісторыі Цімафей АВІЛІН**. — Напрыклад, убачыўшы на небе вельмі яркі метэор, казалі: «Цмок паляцеў! Чарадзею ці ведзьме золата панёс». Гэта быў адзін з варыянтаў тлумачэння свету і сябе ў ім.



Астранамічныя веды былі неабходныя тагачасным людзям для штодзённага карыстання: веданне дакладнага месца размяшчэння на небе пэўных зорак, сузор'яў і планет давала магчымасць арыентавацца ў прасторы і часе, вызначаць, калі пачынаць пэўныя сельскагаспадарчыя работы, калі адзначаць святы.

Да прыходу на тэрыторыю сённяшняй Беларусі крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў нашы землі засялялі балцкія плямёны. І ўжо тады, у глыбокай старажытнасці, людзі ведалі, што Зорны Кол (Палярная зорка) застаецца на адным месцы і яго можна выкарыстоўваць у якасці арыенціру ў прасторы.

— Астранамічным аб'ектам прыпісваліся магічныя ўласцівасці, — працягвае даследчык. — Нашы продкі верылі ў існаванне душы, верылі, што калі чалавек нараджаецца, на небе запальваецца новая зорка. Такім чынам, у кожнага чалавека ёсць свая зорка на небе, і калі гэта добры чалавек — яна будзе яскравай, а пра нядобрага казалі: «Шэльма з-пад цёмнай зоркі». Гэта, з аднаго боку, перанос уласцівасцяў душы чалавека на зорку, а з другога — крыху магія, чарадзейства.

Асноўнымі аб'ектамі астранамічных назіранняў нашых продкаў былі Сонца, Месяц, сузор'і (Вялікая Мядзведзіца, Плеяды і Пояс Арыёна), Венера і іншыя зоркі, метэоры і каметы.

СТАР. 5

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 10 сентября 2010 г.*

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых							Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых					
	Срок, дни							Срок, дни					
	100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	13,50	14,50	15,50	16,00	16,50	17,00	17,50	8,50	9,10	9,70	10,30	10,90	11,50
1 000 001 – 10 000 000	14,00	15,00	15,75	16,25	16,75	17,25	17,75	8,70	9,30	9,90	10,50	11,10	11,70
10 000 001 и более	14,50	15,50	16,00	16,50	17,00	17,50	18,00	8,90	9,50	10,10	10,70	11,30	11,90
Доллары США													
1 – 500	4,25	5,75	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	2,50	3,50	5,00	5,50	6,00	6,50
501 – 5 000	4,75	6,00	6,50	7,00	7,40	7,70	8,00	3,00	4,00	5,25	5,75	6,25	6,75
5 001 и более	5,25	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	8,25	3,50	4,50	5,50	6,00	6,50	7,00
Евро													
1 – 500	4,25	5,75	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	2,50	3,50	5,00	5,50	6,00	6,50
501 – 5 000	4,75	6,00	6,50	7,00	7,40	7,70	8,00	3,00	4,00	5,25	5,75	6,25	6,75
5 001 и более	5,25	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	8,25	3,50	4,50	5,50	6,00	6,50	7,00
Российские рубли													
1 – 15 000	7,50	9,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	5,50	7,50	8,00	8,50	9,00	10,00
15 001 – 150 000	8,00	9,75	10,25	10,75	11,15	11,45	11,75	6,00	7,75	8,25	8,75	9,50	10,50
150 001 и более	8,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	12,00	6,50	8,00	8,50	9,00	10,00	11,00

* Настоящие ставки применяются:
- для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой, заключенных в период с 06.03.2006 до 10.09.2010 – с 10.10.2010;
- для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой и фиксированной процентной ставкой, заключаемых с 10.09.2010 – с 10.09.2010.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк». Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.

Информация о размере процентов, выплаченных по вкладам в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка – www.belapb.by.

Сведения о выплаченных процентах по срочным вкладам (депозитам) ОАО «Белагропромбанк» в 2009 году в эквиваленте, млн бел. рублей:

январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	итого
17 034,9	18 992,1	22 929,6	22 257,7	20 483,6	21 032,6	20 270,5	20 059,1	19 557,1	20 205	21 320,3	22 134,4	246 277

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.09.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	3 030,00	1 чэшская крона	155,56
▼ 1 еўра	3 849,31	1 польскі злоты	973,89
1 латвійскі лат	5 418,94	▼ 1 расійскі рубель	98,10
1 літоўскі літ	1 112,64	1 украінская грыўня	381,85

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,8873
10 UAH	38,9401
1000 BYR	10,2039
EUR	39,2948

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Парламенцкі дзённік

КАЗКА Ў ГАСЦЯХ У НАС

Данія зацікаўленая ў супрацоўніцтве з Беларуссю — як на эканамічным, так і на палітычным узроўні

Дацкія парламентарыі гэтымі днямі знаёмяцца з Беларуссю. Іх перамовы з беларускімі калегамі прайшлі калі не ў казачнай, то ў досыць пазітыўнай танальнасці. **Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Віктар ГУМІНСКІ** выразіў задавольненасць з той нагоды, што паміж двума парламентамі склаліся добрыя адносіны. На думку палітыка, так і павінна быць, бо абедзве краіны знаходзяцца ў рэгіёне Балтыйскага мора і маюць шмат агульных інтарэсаў. Асаблівую падзяку віцэ-спікер выразіў за падтрымку, аказаную падчас 18-й Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора ў Нюрнбергу.

— Ад асобных еўрапейскіх дэпутатаў гучалі прапановы па ўключэнні ў склад беларускай дэлегацыі і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. Дацкі парламент заняў прынцыповую пазіцыю, што будзе весці дыялог толькі з парламентам Беларусі. І мы гэта вельмі шануем, — прызнаецца беларускі палітык.

Удзячныя парламентарыі і за падтрымку датчанамі беларускай рэзалюцыі па чарнобыльскім пытанні ў ПА АБСЕ, а таксама беларускай заяўкі на атрыманне статусу назіральніка ў Савеце дзяржаў Балтыйскага мора.

— У нас існуе ўзаемапавага, раўнапраўны падыход да цэлага шэрагу пытанняў, — рэзюмуе В. Гумінскі.

А бягучы візіт, паводле яго чаканняў, паспрыяе ўмацаванню не толькі міжпарламенцкіх сувязяў, але і двухбаковых адносінаў у цэлым.

— Каралеўства Данія — эканамічна развітая дзяржава, аднак мы спадзяёмся, вы зможаце пераканацца, што і Беларусь многае зрабіла ў сваім эканамічным развіцці. Пабачыце, як жыве беларускі народ, і ў вас, спадзяёмся, сфарміруецца аб'ектыўная ацэнка таго, што тут адбываецца.

Кіраўнік дэлегацыі, старшыня Камітэта дацкага парламента па знешняй палітыцы, Ева К'ер ХАНСЕН акцэнтавала адкрытасць да ўзаемадзеяння. І словам госці з радзімы казак так хочацца верыць.

— Мы зацікаўленыя ва ўзаемавыгадных, суседскіх (пакольку Беларусь мяжуе з краінамі ЕС) адносінах з Беларуссю, пашырэнні нашага супрацоўніцтва не толькі ў сферы бізнэсу і гандлю, але і на палітычным узроўні.

Сустрэчы на парламенцкім, а таксама іншых узроўнях, на яе думку, вельмі важныя: яны садзейнічаюць паглыбленню супрацоўніцтва і ў выніку — паляпшэнню жыцця людзей.

— Мы зацікаўленыя ў любой інфармацыі пра вашу краіну, — адзначае кіраўнік Камітэта, з якім дацкі ўрад кансультуецца па пытаннях знешняй палітыкі, і тут жа ўдакладняе, што найбольшы інтарэс уяўляюць звесткі пра кантакты Беларусі з міжнароднымі ўтварэннямі (у прыватнасці, з Паўночным Саветам, ЕС), а таксама пра тое, як тут прымаюцца рашэнні...

Ала МАЧАЛАВА.

АДКРЫТАЯ РАЗМОВА ПРА НАБАЛЕЛАЕ

Блізкая ўлада

СТАРШЫНЯ Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР сустрэўся з калектывам Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання. У сустрэчы прыняў удзел і старшыня канцэрна «Беллегпрам» Генадзь ВЫРКО.

Сітуацыя на прадпрыемстве складаная. Рэнтабельнасць нулявая. Запасы прадукцыі выраслі да 23 млрд рублёў. ББВА засталося без сыравіны і абаротных сродкаў.

Кіраўнік вобласці лічыць, што адказнасць за такі стан спраў нясе кіраўніцтва прадпрыемства. Ён звярнуў увагу на той факт, што нават у Брэсце аб'яднанне не мае сваёй крамы, а на ўсю краіну ў прадпрыемства ўсяго дзве фірмовыя крамы.

У аб'яднанні новы генеральны дырэктар — Іван Турчак, які да гэтага ўзначальваў камбінат надомнай працы. Дзяржава ўжо ўклала ў баваўнянае аб'яднанне 90 млрд рублёў, але прадпрыемству патрэбна далейшая падтрымка. Дэбіторская запазычанасць ББВА хутка дасягне 30 млрд рублёў. І гэта пры тым, што склады прадпрыемства запоўненыя тканінай даволі добрай якасці. Калі б удалося рэалізаваць прадукцыю, то эканамічная сітуацыя ў тэкстыльшчыкаў значна палепшылася б.

Кіраўнік канцэрна Генадзь Вырко заявіў, што баваўна будзе закупляцца цэнтралізавана, а гэта дасць магчымасць знізіць цану на сыравіну. Для мадэрнізацыі вытворчасці канцэрн выдзеліць ББВА 160 млрд рублёў.

— Але пры любой падтрымцы прадукцыя не павінна ляжаць на складах, — падкрэсліў старшыня «Беллегпрама».

Падчас сустрэчы з тэкстыльшчыкамі кіраўнік Брэсцкага аблвыканкама К. Сумар закрануў і іншыя праблемы горада.

Ён звярнуў увагу на тое, што Лядовы палац у Баранавічах стратны.

— Неабходна выправіць сітуацыю. У вобласці ўсе спартыўныя комплексы ўжо сябе акупляюць, — заявіў кіраўнік Брэстчыны, — а яшчэ мы павінны асвоіць 240 млрд рублёў, якія выдзелены на будаўніцтва воднага спартыўнага комплексу.

Старшыні аблвыканкама задалі пытанне наконт правядзення абласных «Дажынак» у Баранавічах.

Канстанцін Сумар не супраць таго, каб у наступнай пяцігодцы «Дажынкі» прайшлі ў Баранавічах, і адзначыў, што гэтае мерапрыемства хоць і прыемнае, але дарагое. Сёлета абласное свята ўраджаю ў Маларыце абыдзецца вобласці ў 140 млрд рублёў. А абласны бюджэт мае мяжу. Вось выдзелены грошы на прывядзенне ў парадак вуліц Шаўчэнкі і Уральскай, а яшчэ неабходна знайсці сродкі для таго, каб адрамантаваць гінекалагічнае аддзяленне радзільнага дома, знайсці грошы на будаўніцтва дзіцячага сада ў новым мікрараёне Бараўкі...

Гаворка ішла не толькі пра праблемы, але і пра тое, што зроблена ў горадзе і вобласці. За пяцігодку на Брэстчыне было пабудавана больш за тры мільёны квадратных метраў жылля. У вобласці створаны ўсе ўмовы для прадпрымальніцтва: сёння кожны шосты жыхар Брэстчыны працуе ў прыватным сектары.

Добра, што размова атрымалася шчырай.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БЕЛАРУСКУЮ МОВУ НАЗВАЛІ РОДНАЙ 60 ПРАЦЭНТАЎ ЖЫХАРОЎ РЭСПУБЛІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак, падкрэсліла Алена Кухарэвіч, у структуры непрацаздольнага насельніцтва зніжаецца колькасць людзей маладзейшых за працаздольны ўзрост, якія ў будучым маглі б папоўніць рады працуючых. Паводле даных перапісу насельніцтва 1970 года, на 1000 чалавек у працаздольным узросце прыпадала 586 дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, у 1979 годзе — 429 чалавек, у 1989-м — 437, у 1999-м — 371, а ў 2009 годзе на 1000 працаздольных прыпадала толькі 258 дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў. Доля жанчын старэйшых за працаздольны ўзрост складае 30 працэнтаў, мужчын — 14 працэнтаў у агульнай колькасці асобаў гэтага полу.

Работа — асноўная крыніца сродкаў існавання для 45 працэнтаў жыхароў Беларусі. Работу ў якасці асноўнай крыніцы сродкаў існавання назвалі 4 млн 255 тыс. чалавек, а сярод насельніцтва ў працаздольным узросце жывуць за кошт работы каля 70 працэнтаў рэспандэнтаў.

Стыпендыю, пенсію, дапамогу, іншы від дзяржаўнага забеспячэння лічаць сваёй асноўнай крыніцай сродкаў існавання 27 працэнтаў жыхароў краіны. Сярод сельскіх жыхароў іх доля перавышае 36 працэнтаў, што звязана з узроставай структурай сельскага насельніцтва. На ўтрыманні знаходзіцца 23 працэнты насельніцтва краіны, з іх амаль 90 працэнтаў — моладзь да 25 гадоў. Яшчэ 5 працэнтаў жыхароў Беларусі маюць іншыя крыніцы папаўнення свайго бюджэту.

З агульнай колькасці насельніцтва краіны адну крыніцу сродкаў існавання адзначылі 8 млн 201 тыс. чалавек (86 працэнтаў), дзве крыніцы — 1 млн 90 тыс. чалавек (11 працэнтаў). Пры правядзенні перапісу ўлічваліся крыніцы, як у грашовай, так і ў натуральнай форме, якія былі ў рэспандэнтаў у 2009 годзе.

За дзесяцігоддзе доля насельніцтва Беларусі, старэйшага за працаздольны ўзрост, павялічылася, а доля насельніцтва, маладзейшага за працаздольны ўзрост, зменшылася. Так, калі па выніках папярэдняга перапісу насельніцтва, які адбыўся ў 1999 годзе, людзей старэйшых узростаў было 21,5 працэнта ў агульнай колькасці жыхароў краіны, то па выніках перапісу 2009 года — ужо 22,5 працэнта. А ўдзельная вага насельніцтва, маладзейшага за працаздольны ўзрост, знізілася з 21,2 працэнта ад 15,9 працэнта адпаведна.

За 10 гадоў пасля перапісу 1999 года колькасць дзяцей у цэлым па рэспубліцы зменшылася на 620 тыс. чалавек (амаль на 30 працэнтаў), у тым ліку ў сельскай мясцовасці — на 37,6 працэнта. Такое значнае скарачэнне колькасці дзяцей звязана з падзеннем нараджальнасці ў 90-х гадах, што асабліва адбілася на дынаміцы ўзростаў групы 10—14 гадоў. За міжперапісны перыяд колькасць дзяцей у гэтым узросце зменшылася ў 1,7 раза. У кастрычніку мінулага года ў найбольш актыўным дзетародным узросце 20—34 гады знаходзіліся на 39 тыс. жанчын больш, чым у 1999 годзе, а іх удзельная вага павялічылася з 19,7 працэнта да 21,4 працэнта.

Што датычыцца жыхароў краіны ў працаздольным узросце, то іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва Беларусі павялічылася з 57,3 працэнта ў 1999 годзе да 61,6 працэнта ў 2009 годзе. Гэты паказчык прадстаўнік Белстата лічыць высокім. Колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце на момант перапісу склала 5 млн 853 тыс. чалавек — гэта амаль на 2 працэнты больш (больш як на 100 тыс. чалавек) у параўнанні з данымі перапісу насельніцтва 1999 года.

Алена Кухарэвіч падкрэсліла, што для Беларусі, як і для іншых еўрапейскіх краін, характэрны працэс старэння насельніцтва. Гэта выяўляецца ў паступовым павелічэнні долі старэйшых узроставых груп (65 гадоў і старэйшых) ва ўзроставай структуры насельніцтва. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі ўдзельная вага людзей ва ўзросце 65 гадоў і старэйшых складае 7 працэнтаў і больш. Паводле даных перапісу 2009 года, у цэлым па краіне гэты паказчык перасягнуў 14 працэнтаў, у структуры сельскага насельніцтва ён наблізіўся да 23 працэнтаў.

28 тыс. жыхароў Беларусі, або 0,3 працэнта насельніцтва, адмовіліся ад удзелу ў перапісе. Людзі адмаўляліся адказваць на пытанні перапісных лістоў у асноўным па рэлігійных меркаваннях.

Алена Кухарэвіч падкрэсліла, што атрыманыя ў ходзе перапісу насельніцтва звесткі — якасныя, аб'ектыўныя і дакладныя. Інфармацыя, якая характарызуе эканамічную актыўнасць насельніцтва, знаходзіцца ў распрацоўцы. Белстат завершыць яе ў пачатку лютага наступнага года.

МІНСК ЗАПРАШАЕ НА «САЛОДКІ» ФЕСТЫВАЛЬ

11 верасня ў Мінску пройдзе першы кандытарскі фестываль «Асалодкі — 2010». Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына Гусева. «Салодкае свята» пачнецца ў 10 гадзін на пляцоўцы каля Палацу спорту, і там жа а 13 гадзіне адбудзецца буйное прадстаўленне. Пры гэтым госці фестывалю змогуць пабачыць канцэрт, паўдзельнічаць у шматлікіх конкурсах (напрыклад, па з'яданні шакаладак на хуткасць), пагадаць на цукерках, пабачыць касцюмы з цукерачных фанцікаў, пагуляць пад цукерачнымі, зефірнымі і шакаладнымі дрэвамі, а таксама пакаштаваць (і абавязкова набыць!) прадукцыю беларускіх кандытараў. Дарэчы, чакаецца, што ўдзел у «Асалодках — 2010» возьмуць практычна ўсе айчынныя вытворцы, і ў тым ліку «Камунарка», «Спартак», «Слодыч», «Чырвоны харчавік», «Чырвоны Мазыранін», «Конфа» і «Першая шакаладная кампанія».

Сяргей ГРЫБ.

Ні даць, ні ўзяць... не паспелі

У кватэры дома па вуліцы Маскоўскай ў Брэсце затрымалі службовую асобу транспартнага прадпрыемства. Тут меласа адбыцца перадача хабару за выдачу дазволу на выкананне пасажырскіх перавозак. Як паведамілі ў прэс-службе абласнога ўпраўлення УС, менавіта гэтая службовая асоба схіляла зацікаўленых людзей да дачы хабару. Цяпер ва ўсім будзе разбірацца следства.

Яна СВЕТАВА.

ЧАГО БЫЛО ЛЕЗЦІ?

З пячной трубы зернесушыльнага комплексу ў вёсцы В. Якавічы Пружанскага раёна ўпаў чалавек і забіўся.

Што там рабіў 23-гадовы непрацуючы жыхар суседніх Арабнікаў, высвятляе зараз пракуратура.

Яна СВЕТАВА.

Дзве даты

9 верасня

1815 год — у сям'і прыходскага святшчэнніка Мінскай губерні нарадзіўся Іосіф Антонавіч Гашкевіч, вядомы дыпламат, навукоўца-мовазнаўца, даследчык Далёкага Усходу, натураліст. Скончыў Мінскую, затым Пецярбургскую духоўныя семінарыі. Вывучаў кітайскую, карэйскую, японскую, англійскую, нямецкую, французскую, лацінскую, грэчаскую і іншыя мовы, даследаваў культуру і філасофію Кітая і Японіі. У 1854 годзе з яго ўдзелам заключаны Сімодскі трактат — першы руска-японскі дагавор, які паклаў пачатак двухбаковым дыпламатычным і гандлёвым адносінам. У 1858-65 гадах быў першым расійскім консулам у Японіі. Першы замежнік, якому было дазволена выехаць за межы японскай сталіцы і здзейсніць вандраванне па краіне. З 1867 года — у адстаўцы, жыў у маёнтку Малі (цяпер вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці). Выдадзены ім першы ў Расіі «Японска-рускі слоўнік» адзначаны медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй. Аўтар работы «Карані японскай мовы». Калекцыі флоры і фаўны Паўднёвай Афрыкі, сабраныя падчас вандраванняў, перадаў заалагічнаму музею АН у Пецярбургу. Памёр у 1875 годзе.



1776 год — зацверджана новая назва Аб'яднаных Калоній Амерыкі — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Цытата дня

«Мары слабых — уцёкі ад рэчаіснасці; мары моцных людзей фарміруюць рэчаіснасць».

Юзэф Бестэр.

Бернд ШТАНГЕ:

Футбол

«Румыны радаваліся гэтаму ачку»

Нацыянальная каманда лідзіруе ў групе D, моладзевая зборная прабілася ў плэй-оф чэмпіянату Еўропы

Наша нацыянальная каманда і моладзевая зборная правялі чарговыя матчы адбору да чэмпіянатаў Еўропы 2012 і 2011. Цуда, якога чакалі балельшчыкі ад галоўнай каманды, не выйшла: у другога пасля Францыі фаварыта групы, румынаў, адабраць тры ачкі не атрымалася. Аднак хоць спадзяванні нашы былі звязаныя з перамогай, мы ведаем, яе лёгка маглі і прайграць. Супернік быў не з простых — сяміразовы ўдзельнік чэмпіянатаў свету і чатырохразовы — чэмпіянатаў Еўропы, у 1994 годзе румыны станавіліся чвэрцьфіналістам чэмпіянату свету, у 2000-м — чвэрцьфіналістам чэмпіянату Еўропы. Так што нічыя — прымальны вынік. Затое моладзевая каманда, выйграўшы ў равеснікаў з Азербайджана, з 17 ачкамі заняла другое месца ў сваёй групе. А пасля заканчэння ўсіх матчаў у астатніх групах стала вядома, што нашы футбалісты ў ліку чатырох лепшых каманд, якія занялі другія месцы, праходзяць у плэй-оф чэмпіянату Еўропы!

Водгаласам перамогі ў Парыжы быў і амаль поўны стадыён «Дынама» (тысяч трыццаць балельшчыкаў запоўнілі трыбуны), і народны ансамбль, удзельнікі якога ў нацыянальных касцюмах прама на ўваходзе сустракалі балельшчыкаў і запрашалі патанчыць, і ўся шоу-праграма з беларускімі артыстамі перад матчам. Але нашы футбалісты так і не змаглі ні разу за матч трапіць у створ варот. Самым небяспечным момантам ля варот суперніка быў бадай што выхад адзін на адзін з варатаром Сяргеем Карніленкі на 8-й хвіліне і яго ўдар з вострага вугла. Ускалыхнулася сетка, стадыён падскочыў, гатовы ўзарвацца авацыямі... Але хутка стала зразумела, што мяч трапіў у знешнюю сценку варот. Сяргей Кісляк, які выйшаў цяпер у стартавым складзе, некалькі разоў таксама імкнуўся паразіць вароты з дальніх дыстанцый, аднак дарэмна. Аляксандр Глеб выдатна абыгрываў сваіх візаві, пасаваў брату, у якога у гэтай гульні атрымлівалася не так гладка, як у Парыжы. Глеб-старэйшы, дарэчы, атрымаў у матчы траўму, таму ў бліжэйшай гульні за англійскі «Бірмінгем» на поле не выйдзе. Падключаліся да атак крайнія абаронцы Шытаў і Юрэвіч, аднак і гэта вынікаў не прыносіла.

Добра таксама тое, што не ўсё атрымлівалася ў румынаў. Моманта ў, трэба аддаць ім належнае, у гасцей было куды больш. Але наш галкіпер Жаўноў здолеў захаваць вароты ў недатыкальнасці, за што адзін са спонсараў абяцаў падарыць яму і Кісляку, які забіваў французам, электронныя кнігі «Прэстыжыа».

Пасля матчу Рэзван Лучэску, трэнер румынскай зборнай, так і сказаў, што яго падапечныя заслугоўвалі перамогі, але не хапіла ўдачы. Бернд Штанге не пагадзіўся:

— Ні адна з каманд у гэтым матчы не дастойная перамогі. Гульня была роўнай. Мы надта не рызыкавалі, бо ведалі, як румыны могуць контратакаваць. Мы павінны паляпшаць свае навыкі ў камбінацыйным футболе.

Увогуле ж нямецкі спецыяліст адзначыў, што за дзве стартавыя гульні наша зборная заслугоўвае толькі кампліментаў.

— Гэта добры пачатак кваліфікацыі. Я бачыў, як радаваліся румыны гэтаму ачку, і тут можна зрабіць выснову, што ў нас моцная каманда. Пасля гэтых матчаў можна сказаць, што наша мэта — заняць у групе першае месца.

Хоць і разлічвала наша каманда на перамогу, нічыёй гер Штанге не расстроены:

— У любым выпадку лічу, што ачко мы набылі, а не страцілі два. Лічыце, што ў Францыі мы згулялі ўнічыю, а тут выйгралі... Калі б да пачатку кваліфікацыі мне сказалі, што ў двух стартавых матчах мы атрымаем чатыры ачкі, я адразу б пагадзіўся...

І сапраўды, цяпер у нашай групе першыя месцы пасля двух матчаў займае Албанія і Беларусь, а не фаварыты Францыя і Румынія. У кастрычніку нас чакаюць матчы ў Люксембургу і ў Магілёве супраць Албаніі.

Гульня з Азербайджанам стала няпростай для нашай моладзевай каманды. Першы тайм скончыўся ўнічыю, і гэта не давала ніякіх падстаў для выхаду ў плэй-оф. Толькі на 76-й хвіліне Паўлу Няхайчыку ўдалося вывесці нашу каманду наперад, чым ён і заслужыў кампліментаў галоўнага трэнера Георгія Кандрацьева:

— Няхайчык і выцягнуў гэты матч. Столькі браку я яшчэ не бачыў. Напэўна, гэта наша першая гульня з такой колькасцю памылак. Вядома, матч далёка не лепшы, але лепш выйграць пры дрэннай гульні, чым прайграць з добрай. Мы дасягнулі выніку і ідзём далей. Хлопцы ў раздзявальні радуюцца. Зразумела, што перад матчам перахваляваліся. Яны вельмі хацелі выйграць, а супернік выйшаў гуляць у сваё задавальненне. Але пераможцаў не судзяць, — заявіў Георгій Кандрацьеў.

Будзем хварэць за нашых футбалістаў і спадзявацца, што ў стыкавых матчах, дзе супернікамі беларусаў могуць быць каманды Англіі, Іспаніі і Ісландыі (жараб'ёўка пройдзе ў пятніцу, 10 верасня), ім будзе спадарожнічаць удача.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАСАЖЫРЫ ТУ-154 ЦУДАМ ЗАСТАЛІСЯ ЖЫВЫЯ

Пасажырскі самалёт Ту-154 авіякампаніі «Алроса», які ляцеў з Якуціі ў Маскву, раніцай 7 верасня здзейсніў аварыйную пасадку на вайсковым аэрадроме ў Комі.

На борце паветранага судна знаходзіліся дзевяць членаў экіпажа і 72 пасажыры, у тым ліку дзеці. Пасля вылету з аэрапорта «Палярны» ў Якуціі на вышыні больш за 10 кіламетраў на борце самалёта адмовіла сістэма электрасілкавання, а таксама абсталяванне навігацыі і радыёсувязі. Пасля зніжэння высветлілася, што расходны паліўны бак перастаў напаўняцца з-за адмовы электрапомпаў. Аварыйная пасадка была зроблена на паласу вайсковага аэрадрома ў Іжме, не прыстасаваную для цяжкіх паветраных суднаў. Па словах членаў экіпажа, гэтая паласа выкарыстоўваецца як верталётная пляцоўка. Акрамя таго, з-за адмовы электрапрывадаў не былі выпушчаныя перадкрылкі і закрылкі лайнера, з-за чаго пасадку прыйшлося праводзіць на павышанай хуткасці. Тым не менш ніхто не пацярпеў, а самалёт атрымаў толькі нязначныя пашкоджанні. З-за недахопу месцаў у гасцініцы пасажыраў размясцілі ў мясцовым спарткомплексе.

ЗАБАСТОЎКА Ў ФРАНЦЫІ САБРАЛА 2,5 МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК

У другі дзень агульнанацыянальнай забастоўкі, пачатай у Францыі 6 верасня, пратэстуючым удалося вывесці на вуліцы па ўсёй краіне 2,5 мільёна чалавек.

Афіцыйныя ацэнкі колькасці забастоўшчыкаў былі істотна больш сціплымі, чым у прафсаюзаў.

Прайшоўшыя выступленні павінны былі выліцца ў адмену ў краіне паловы рэйсаў на чыгункі, скарачэнне каля 25 % авіярэйсаў міжнародных перавозчыкаў у Парыжы, а таксама сур'ёзна ўскладніць працу парыжскага метро. Прычынай забастоўкі стаў план урада краіны павялічыць пенсійны ўзрост з 60 да 62 гадоў. Французскі прэзідэнт Нікаля Сарказі заяўляў, што лічыць пенсійны законапраект «абсалютным прыярытэтам», нягледзячы на тое, што ён быў негатыўна сустрэты лідарамі прафсаюзаў.

МЯДЗВЕДЗЬ ЗБІРАЕЦЦА Ў ПРЭМ'ЕРЫ ЛАТВІІ

На пост прэм'ер-міністра Латвіі вылучаны незвычайны кандыдат. Гэта белы паралонавы мядзведзь, якога Апошняя партыя прапаноўвае зрабіць кіраўніком кабінета міністраў краіны.

«Апошняя партыя ў якасці свайго кандыдата на пост прэм'ер-міністра Латвіі выцягнула Мядзведзя шчасця, персанажа п'есы Андрэя Упітса (вядомы латышскі пісьменнік)», — сказаў старшыня партыі Гінтс Кнокс. Палітык дадаў, што мядзведзь — «шырока вядомая культурная асоба, якая дала адукацыю некалькім пакаленням латвійцаў». Прадстаўнікі партыі ўжо зрабілі з паралону двухметровую постаць Мядзведзя шчасця і спадзяюцца, што выбаршчыкі яго падтрымаюць. Мяркуецца, што ў адкрыты рот клышаногага выбаршчыкі будуць кідаць пажаданні, якія ён «прыме блізка да сэрца». Цэнтральная выбарчая камісіі Латвіі пакуль ніяк не пракаментавала кандыдатуру паралонавага мядзведзя. Самі ж выбары ў Сойм Латвіі пройдуць у рэспубліцы 2 кастрычніка.

Апошняя партыя была заснаваная ў чэрвені 2010 года, каб выкрываць папулізм палітычных сілаў, якія змешчаныя ва ўладзе. У якасці дэвізу члены партыі абралі распаўсюджаны адказ на пытанне аб палітычных перавагах — «Не ведаю, не вырашыў».

МАСКОЎСКІ СЛУЖБОВЕЦ ПААБЯЦАЎ ЗАЧЫНІЦЬ СТАНЦЫЮ «БЕЛАРУСКАЯ»

Кіраўнік дэпартамента транспарту і сувязі горада Масква Васіль Кічэджы расказаў журналістам аб магчымым зачыненні станцыі Маскоўскага метрапалітэна «Беларуская» — як Кольцавай, так і Замаскварэцкай лініі, паведамляе РІА Навіны. З чым звязаныя такія планы, службовец не патлумачыў.

Паводле слоў Кічэджы, нічога сакрэтнага ў магчымым зачыненні няма: «Выпусцім пастанову ўрада, вы аб усім даведаецеся». Службовец удакладніў, што станцыя можа быць зачыненая ў 2011 годзе, аднак не растлумачыў, на які тэрмін. Пераход паміж радыяльнай і кольцавай станцыямі «Беларуская» зачынены з мая 2010 года. Гэта было зроблена для замены эскалатараў. Чакаецца, што пераход адкрыецца зноў да канца года. Акрамя гэтага, раней паведамлялася, што «Беларускую» плануецца абсталяваць датчыкамі радыехімічнага кантролю.

Абзац

◢ **80 гадоў з дня нараджэння Юрыя Гуляева — спевака, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.**

◢ Гаспадаркі Беларусі, па звестках на ўчарашні дзень, убралі грэчку на 10,6 тыс.га, што складае 30,6 % засеяных плошчаў. Намалочана 11,7 тыс. т зерня, ураджайнасць складае 11,1 ц/га. Самая высокая ўраджайнасць у Гродзенскім рэгіёне — 16,3 ц/га.

◢ **Віцебскі гарвыканкам задаволіў шматлікія просьбы жыхароў Віцебска і забараніў гандаль гарэлкай і півам з 23 да 8 гадзін у крамах, якія працуюць кругласутачна. Рашэнне мясцовай улады ўступіла ў сілу. Пасля прыняцця такога рашэння колькасць крамаў з кругласутачным рэжымам працы ў абласным цэнтры скарацілася з 8 да 3. У адным з магазінаў, якія засталіся, з 23 да 8 гадзін забараняецца рэалізацыя спіртовых напояў і піва, у двух другіх — продаж гарэлкі па фіксаваных коштах і піва.**

◢ Мэр Мінска збіраецца выселіць кракадзілаў са сталічных кватэр. Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька лічыць магчымым пераглядзець у бок большай строгасці правілы ўтрымання ў кватэрах шматпавярховых дамоў хатняй жывёлы для забеспячэння бяспекі грамадзянаў. Як чакаецца, у хуткім часе будзе прынятае адпаведнае рашэнне. Уладальнікі ўсякай жыўнасці павінны ўлічваць нормы супольнага жыцця і не парушаць правілаў утрымання хатніх пітомцаў. «Вось калі ў кватэры паверхам вышэй жыве, скажам, ядавітая змяя альбо кракадзіл, то гэта выклікае ў чалавека пэўны непакой, хоць напрамую ён з гэтым кракадзілам не кантактуе. Але непакой ёсць, паколькі існуе магчымасць пагрозы», — сказаў М. Ладуцька.

◢ **Супрацоўнік міліцыі падчас палявання ў Краснапольскім раёне па неасцярожнасці забіў таварыша. Супрацоўнік Краснапольскага РАУС разам з прадаўніком адміністрацыі зонаў адчужэння і адсялення па гэтым раёне незаконна палявалі на дзіка паблізу вёскі Палуж-1. Міліцыянер, які памылкова прыняў таварыша за звера, прычыніў са свайго зарэгістраванага паляўнічага ружжа смяротнае агнястрэльнае раненне. Заведзена крымінальная справа.**

◢ У Івацэвічах электрацягніком траўмаваны 18-гадовы хлопец. Нядаўні выпадак здарыўся 7 верасня ў 23.26 на чыгуначнай станцыі «Івацэвічы». Малады чалавек, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, упаў з перона перад электрычкай «Брэст — Мінск». Юнак, навучэнец Баранавіцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя будаўнікоў, з траўматычнай ампутацыяй ног змешчаны ў рэанімацыйнае аддзяленне Івацэвіцкай бальніцы. Пацярпеламу зроблена аперацыя, яго стан цяжкі.

◢ **Партыя нелегальна перавозімых жывых кветак на Br344 млн канфіскаваная супрацоўнікамі аператыўна-пошукавага аддзела Віцебскай мытні ў Дубровенскім раёне. Ружы і хрызантэмы перавозіліся з Германіі ў Расію на грузавым аўтамабілі DAF, якім кіраваў расійскі грамадзянін. У ходзе дагляду мытнікі выявілі перавышэнне колькасці заяўленага тавару больш чым на 47 тыс. адзінак. Пачаты адміністрацыйны працэс. Так як тавар хутка псуецца, то кветкі паступілі ў спецыялізаваныя гандлёвыя арганізацыі вобласці.**

◢ Сапраўдную кобру злавілі ўчора выратавальнікі ў самым цэнтры Мінска. Заўважылі змяю мінакі па вуліцы Веры Харужай. Кобра паўзла па лесвіцы, а людзі здымалі яе на камеры мабільных тэлефонаў. Супрацоўнікам МНС давялося шмат папрацаваць, каб злавіць змяю. Яе даўжыня не перавышае метра, але яна вельмі небяспечная. Выратавальнікі перадалі знаходку супрацоўнікам заапарка. Як змяя з'явілася на ганку крамы — невядома. Гэта трэці выпадак літаральна за месяц, гавораць выратавальнікі. Першыя дзве змяі былі бяскодныя для людзей.

Поўны абзац

◢ **Расійскія прыставы арыштавалі за даўгі акварыумных рыбак жыхара Башкартастана, які не змог вярнуць банку буйную суму грошай. У загарадным доме ўфімца прыставы выявілі акварыум з імітацыяй марскога дна, які быў уманціраваны ў сцяну. Эксперты вызначылі, што сярод рыбак аказаліся вельмі рэдкія віды. Зараз рыбкі знаходзяцца на захаванні ў спецыялістаў. Іх прададуць, а выручаныя грошы пойдуць у лік пагашэння доўгу. Раней у такіх выпадках арышт накладваўся толькі на дробную і буйную рагатую жывёлу, а таксама пчолаў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 227 44 76, 227 65 53

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 14 (по генплану)» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1762 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 15.10.2009 г.

Земельный участок площадью 0,0855 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 23-этажное, односекционное. Количество жилых помещений жилого дома – 132. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – октябрь 2009 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – апрель 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2009 № 1165-5/09.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство офисных помещений: № 1– площадью 70,6 м², № 2 – площадью 70,53 м², магазина № 1 – площадью 87,94 м², магазина № 2 – площадью 93,99 м².

Предметом договора будет являться строительство нежилых помещений.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади по экспликации нежилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет: офисное помещение № 1 – 5158460 руб.; офисное помещение № 2 – 5179760 руб.; магазин № 1 – 5154660 руб.; магазин № 2 – 5155640 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 16.09.2009 № 5/09, генподрядчик – ОАО «Монолит».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве нежилых помещений будет осуществляться в каб. 401 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

И.о. генерального директора Г.Г. Лапаник

Минский районный исполнительный комитет
21 сентября 2010 г.
повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот 1
1	Адрес земельного участка	Боровлянский с/с, д. Дроздово, У-77
2	Кадастровый номер	623680602601000846
3	Площадь земельного участка	0,1489 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 верасня 2010 г. № 30 (224)

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Трактарам... па прыгажосці?

У выпуску «МС» за 26 жніўня г.г. выйшаў артыкул «А яно мне патрэбна?», у якім прыватныя гаспадары з вёскі Ларынаўка Аршанскага раёна скардзяцца: маўляў, ім перакрылі праезд да крыніцы, «панатыркалі ў зямлю калкоў», і яны не могуць пад'ехаць і набраць вады.

А цяпер — пра тую самую крыніцу. Калі яшчэ не быў праведзены водаправод, жыхары Ларынаўкі (ды і іншых вёсак) бралі ваду менавіта з яе. А пасля таго, як водаправод правялі, крыніцу ператварылі ў... сапраўдны сметнік.

Але ж знайшоўся ў вёсцы чалавек, які вырашыў пачысціць крыніцу сваімі сіламі. Алег Віктаравіч Міцкевіч знайшоў транспарт і за ўласныя сродкі вывез усё смецце, прыбраў тэрыторыю, зрабіў спецыяльную накрыўку, прывёз дзве машыны пяску і насыпаў «дарожку». А побач пасадзіў алею бярозак... Школа забяспечыла крыніцу вядром, каб людзі карысталіся толькі ім і не забруджвалі ваду.

Каля крынічкі стала прыгожа і ўтульна, і менавіта гэтую прыгажосць Алег Віктаравіч імкнуўся падтрымліваць на працягу трох апошніх гадоў. Сёлета паставіў там лавачку, каб людзі, якія прыходзяць па ваду, маглі прысесці і адпачыць...

Але два месяцы таму ў вёсцы Ларынаўка пачаліся перабоі з вадой — яна то з'яўлялася, то знікала. І мясцовыя фермеры не прыдумалі нічога лепшага, чым пад'язджаць да крыніцы на брудных машынах ці трактарах і бруднымі шлангамі браць ваду для гаспадарчых патрэбаў — нягледзячы на тое, што паблізу ад вёскі Ларынаўка працякае рака Днепр, і можна было б скарыстацца вадой адтуль.

Алег Віктаравіч вымушаны быў паставіць слупкі каля крыніцы — каб спыніць неахайнае стаўленне да прыроды.

Сёння, на маю думку, трэба больш актыўна весці размову пра добраўпарадкаванне вёскі, пра культуру навакольнага асяроддзя і ўнутраную культуру ўвогуле, а не пра тое, як дабрацца на трактары да чыстай крыніцы. Тым больш што жывём мы побач з прыгожым і дагледжаным горадам Орша.

З павагай Настасся Алегаўна МІЦКЕВІЧ.

Ад рэдакцыі. Наша вёска даўно сумуе па прыгажосці. Не па прыроднай — яе, дзякуй Богу, хапае. А па прыгажосці акультуранай, утульнай, упарадкаванай і незасмечанай. Таму хваляванні і абурэнні нашай чытачкі цалкам зразумелыя. Але давайце паглядзім на тэму крыху шырэй. Ці паехаў бы той фермер да крыніцы, калі б мог узяць ваду ў іншым месцы і ў дастатковай колькасці? Напэўна, не. Таму, хочаш не хочаш, а пытанне натуральным чынам скіроўваецца ў бок мясцовай улады і раённай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аршанскага раёна. Калі воданапорная вежа не спраўляецца з забеспячэннем вёскі вадой, напэўна, трэба падумаць пра яе рэканструкцыю? Тады жыхарам не прыйдзецца абараняць свой «кавалачак прыгажосці» ад сваіх жа аднавяскоўцаў.

ЗЯМЛЯ І НЕБА ВІКТАРА ТАРАСАВА

Кожны раз пасля выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў іх склад аднаўляецца прыблізна на траціну. Новыя людзі прыходзяць з новымі ідэямі і са сваім бачаннем уладкавання свету. Яны маладыя, нецярплівыя, ініцыятыўныя. Ім хочацца перамен тут і цяпер. І такія паняцці, як кампраміс і ўзаемаразуменне, падаюцца ім часам чымсьці анахранічным, гэткім водгукам кансерватыўнага мінулага.



— А ў нашай працы, калі ты ўвесь час кантактуеш з людзьмі «твар у твар», без узаемаразумення і ўзаемадзеяння нельга, — лічыць старшыня Стайскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна Уладзімір ТАРАСАЎ.

Упершыню на пост кіраўніка мясцовай улады яго выбралі ў 1996-м. Гэта быў складаны пасляперабудовачны перыяд, праблемы «выпіралі» адусюль. Пра добраўпарадкаванне тэрыторыі нават і размоў не вялося, бо грошай не хапала на самае неабходнае... З тымі ж воданапорнымі вежамі, помпамі, водаправоднымі сеткамі і калонкамі было столькі пытанняў, што, параўноўваючы той час і цяперашні, Уладзімір Віктаравіч выказваецца лаканічна: «Неба і зямля».

— Сёння, напрыклад, мы можам прадаць зямельны ўчастак з аўкцыёну і такім чынам зарабіць грошы на свае патрэбы. Мясціны ў нас прыгожыя, азёрныя... Сёлета 6 участкаў прадалі, каля 26 мільёнаў рублёў зарабілі. Усе гэтыя грошы застануцца ў сельсавецкім бюджэце і пойдуць на добраўпарадкаванне.

А добраўпарадкаванне — пытанне шырокае, кажа Уладзімір Тарасаў. Вырашыць яго канчаткова — усё роўна што ахапіць неабдымнае. Калі сёння зрабілі добра, дык назаўтра хочацца яшчэ лепш. Летась сельсавецкая ўлада прыняла на свой баланс чатыры абеліскі — помнікі палеглым у часы Вялікай Айчыннай. Тры з іх ужо адрамантаваныя, і да канца года будзе прыведзены ў парадак апошні, чацвёрты.

— Неўзабаве агародзім могілкі, давядзём да ладу грамадскія калодзежы — працы хопіць, таму што атрыманыя сродкі трэба асвойваць. А гэта не толькі зароблена на аўкцыёне, а і падаткі, ды яшчэ грошы, выдаткаваныя сельсавету на добраўпарадкаванне — 10 мільёнаў. Так што, думаю, 30—35 мільёнаў да канца года мы патрацім.

Сёлета ў пярвічным бюджэце ўпершыню з'явіўся асобны «дарожны» артыкул, у адпаведнасці з якім сельсавету выдаткоўваюцца сродкі (каля 8 млн рублёў) на добраўпарадкаванне дарог і вуліц, пра што Уладзімір Віктаравіч паведаміў з радасцю. Безумоўна, асфальт за гэтыя грошы не пакладзеш. Перш за ўсё тут маецца на ўвазе расчыстка ад снегу, дробны бягучы рамонт і падсыпка.

— Але гэта ўжо рэальны зрух. Дзякуючы такому заўважнаму кроку дзяржавы сёлета ў мяне практычна не было праблем з абслугоўваннем дарог... Даём заяўку ў ЖКГ, адтуль прыязджаюць, расчышчаюць дарогу ад снегу, а мы ім потым праплачваем. Вось зімой патрацілі на гэта 3,5 мільёна, а 4 мільёны засталіся — за іх падсыпалі і падрамантавалі яшчэ дзве вуліцы.

Увогуле, працай раённых камунальных службаў (на якія апошнім часам не наракае толькі лянівы) Уладзімір Тарасаў задаволены. У адпаведнасці з рашэннем Лепельскага райвыканкама водаправодныя сеткі сельсаветаў былі перададзеныя на баланс ЖКГ яшчэ восем гадоў таму, задоўга да выхаду Указа Прэзідэнта № 21. І цяпер сістэма водазабеспячэння працуе настолькі зладжана, што не выклікае ніякіх асаблівых нараканняў — ні ў жыхароў сельсавета, ні ў яго кіраўніка.

Як вядома, вышэйзгаданы ўказ увогуле пашырыў магчымасці мясцовай улады ў стварэнні нармальных умоў для жыцця людзей.

— А што такое нармальныя ўмовы? — разважае Уладзімір Тарасаў. — Гэта вада, газ і святло. Гэта калі ёсць што купіць і за што купіць. Калі людзі не сумняваюцца ў тым, што ўлада дапаможа ім апрацаваць прысядзібныя ўчасткі і рэалізаваць лішкі прадукцыі.

Натуральна, што стварэнне адпаведных дабротаў у многім вызначаецца мясцовай фінансавай базай. Бюджэт Стайскага сельсавета (паступленні з усіх магчымых крыніц) складае 139 мільёнаў рублёў. Прычым доля датацыі з раённага бюджэту адносна невялікая — каля 30 працэнтаў. Усё астатняе — уласныя даходы сельсавета. Гэта падаткі за карыстанне зямлёй і нерухомасцю, сродкі, атрыманыя ад продажу ўчасткаў праз аўкцыёны, а таксама адлічэнні (52 працэнты) ад падаходнага падатку з фізічных асобаў. Вось, уласна кажучы, тыя «кіты», на якіх сёння трымаецца пярвічны бюджэт і якія дазваляюць паступова прыводзіць у парадак тэрыторыю сельсавета. Прычым, не толькі яго цэнтр, а і маленькія вёскі.

— На што скардзяцца людзі? Ды нават не магу ўспомніць, каб апошнім часам былі нейкія сур'ёзныя скаргі. У асноўным даводзіцца разбірацца ў так званых «межавых» спрэчках паміж суседзямі, — гаворыць Уладзімір Тарасаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

Танней закрыць, чым адрамантаваць

У «МС» за 24 чэрвеня г.г. быў змешчаны артыкул «Закрыць ці пакінуць?» — пра тое, як жыхары дзесяці вёсак Дубровенскага раёна намагаліся адстаяць сваю ўчастковую бальніцу ў вёсцы Кляны. Мясцовыя ж улады настойвалі на закрыцці гэтай медустановы і прапаноўвалі вяскоўцам лячыцца ў амбулаторыі аграгарадка Зарубы.

Рэдакцыя атрымала пісьмовае рэагаванне Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

«Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам разгледжаны калектыўны зварот жыхароў населеных пунктаў Кляны, Цыбульскія, Быстроўка, Чырына, Ляхаўка, Пячонкі, Жарнеўка, Хаетчына, Баева, Зарубы Дубровенскага раёна па пытанні закрыцця Кляноўскай участковай бальніцы (далей — Кляноўская УБ).

Інфармуем, што медыцынская дапамога жыхарам Кляноўскага сельсавета аказваецца Зарубскай урачэбнай амбулаторыяй (далей — Зарубская УА). Зарубская УА ўкамплектаваная ўрачэбным і сярэднім медперсаналам. У амбулаторыі арганізаваная работа стаматалагічнага кабінета, аптэчнага кіёска, дыягнастычнай лабараторыі. У шырокім дыяпазоне праводзіцца фізіятэрапеўтычнае лячэнне. У Зарубскай УА функцыянуе дзённы стацыянар. На час лячэння ў ім пры наяўнасці паказанняў выдаецца ліст часовай непрацаздольнасці ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі.

Арганізаваныя рэгулярныя выезды ўрачоў-спецыялістаў з установы аховы здароўя «Дубровенская цэнтральная раённая бальніца» для аказання кансультатыўнай дапамогі вясковым жыхарам паводле вызначанага графіка, для тэрміновай кансультацыі здзяйсняюцца пазапланавыя выезды ўрачоў-спецыялістаў. У выпадку неабходнасці стацыянарнага лячэння на кругласутачных ложках, пацыенты шпіталізуюцца ва ўстанову аховы здароўя «Дубровенская ЦРБ» транспартам Зарубскай УА. Фактаў адмовы ў шпіталізацыі і ў выездах хуткай дапамогі ў сельскія населеныя пункты не было. Пацыенты, якія маюць патрэбу ў сястрынскім доглядзе, шпіталізуюцца ў Асінаторфскую бальніцу сястрынскага догляду. Урачэбна-сястрынская брыгада Зарубскай УА рэгулярна выязджае ў населеныя пункты замацаванай зоны абслугоўвання.

Акрамя гэтага, праводзіцца кансультаванне пацыентаў, якія маюць у гэтым патрэбу, у абласных установах аховы здароўя. Накіраванні на абследаванне ў абласныя медустановы выдаюцца ўсім пацыентам без абмежаванняў.

Графік працы Зарубскай УА адаптаваны да графіка руху грамадскага аўтатранспарту.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гг. планавалася рэарганізацыя Кляноўскай участковай бальніцы ва ўрачэбную амбулаторыю і перанос яе ў вёску Зарубы, якая мае статус аграгарадка і з'яўляецца геаграфічным цэнтрам Кляноўскага сельсавета. Вёска Зарубы мае здавальняючае транспартнае забеспячэнне для грамадзян, якія пражываюць у прылеглых населеных пунктах. Увод у строй Зарубскай УА дазволіў палепшыць якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі для насельніцтва.

Будынак Кляноўскай участковай бальніцы ўведзены ў эксплуатацыю ў 1957 годзе, па стане на 1 студзеня 2010 года знос яго складае 98,6 працэнта. Працэнт зносу вызначаецца па зацверджанай методыцы. Ёсць прадпісанні Дубровенскіх РЦГЭ і раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях аб ліквідацыі хібаў у эксплуатацыі будынка або аб закрыцці бальніцы. У будынку бальніцы правісае столь у калідоры і памяшканнях, зацякае вільгаць.

Для аказання кругласутачнай стацыянарнай дапамогі ў Зарубскай УА ў дадзены момант не абсталяваны харчблок, пральня, складскія памяшканні, не закуплена тэхналагічнае абсталяванне. Для ўводу ў эксплуатацыю дапаможных памяшканняў неабходна вынайсці 52 млн рублёў.

Медработнікам і іншаму персаналу Кляноўскай УБ прапанавана працаўладкаванне ва ўстановах аховы здароўя Дубровенскага раёна на ранейшых умовах. Урач Сафронаў А.М. ад прапанаванай пасады ўрача агульнай практыкі ў Зарубскай УА адмовіўся.

Намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Л.Л. КАВАЛЁЎ».

«Любы капрыз, але за вашы грошы...»

Пад такім загалоўкам у № 27 «МС» быў змешчаны ліст спадарыні Русецкай з вёскі Арэхаўка Клічаўскага раёна.

У ім, нагадаем, пастаянная падпісчыца «Звязды» распавядала пра тое, як 22 гады назад атрымала жыллё ў 16-кватэрным доме, як потым разам з суседзямі за вёскай будавалі хлявы, як ім дапамагаў саўгас. Прычым не толькі будматэрыяламі — да пабудоў правялі электрычнасць, водаправод, зрабілі агульную калонку. У вяскоўцаў у выніку з'явілася магчымасць трымаць кароў, іншую свойскую жывёлу... Што яны і рабілі.

Але потым, як пісала Галіна Іванаўна, змяніўся час, і пачаліся розныя непрыемнасці. У гаспадарчых пабудовах не стала электрычнасці, не стала вады, бо знеслі калонку, патлумачыўшы тым, што яна знаходзіцца за вёскай і, так бы мовіць, нічыйнай быць не можа. Можа быць персанальная. Ваду Галіне Іванаўне абяцалі правесці, нават у хлеў, але ўжо за грошы — яе, уласныя.

Каб выручыць іх, скардзіцца гаспадыня, трэба... прадаць карову.

Як паведаміў старшыня Клічаўскага раённага выканаўчага камітэта сп. Вашчыла, зварот сп. Русецкай разгледжаны з выездам на месца. Высветлена, што водаразборнай калонкай, размешчанай каля гаспадарчых пабудоў на адлегласці 300 метраў ад жылога дома, карысталася толькі заяўніца. Таму з-за значных грашовых затрат на ўтрыманне, адсутнасці аплаты за спажытую ваду калонку сапраўды дэманціравалі.

Галіне Русецкай было прапанавана падвесці да хлява водаправод з паілкай і ўстанавіць прыбор уліку вады, аплаціўшы за выкананыя работы 350 000 руб. Астатнія затраты (1 250 000 руб.) брала на сябе ўнітарнае камунальнае прадпрыемства «Жылкамгас». Аднак ад гэтай прапановы заяўніца адмовілася.

У жніўні 2010 г. сіламі УКП «Жылкамгас» каля гаспадарчых пабудоў выкапаны калодзеж. Затраты на яго ў памеры 350 000 руб. аплачаны заяўніцай, астатнія (650 000 руб.) панесла камунальнае прадпрыемства.

Іншымі словамі, праблема з вадой знятая.

І цяпер застаецца толькі адно — пашкадаваць, што яна, узнікшы, папсавала столькі крыві.

Чаго не здарылася б, калі б перш, чым нешта зрабіць (у гэтым выпадку даць каманду знесці калонку), кіраўніцтва таго ж камунальнага прадпрыемства падумала пра тое, чым гэта абернецца. Для чалавека. Хай і аднаго.

ЧЫМ БОЛЬШ УВАГІ — ТЫМ БОЛЬШ ПРЭТЭНЗІЙ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Згодна з сусветнай палітычнай традыцыяй, новаабранай ці новапрызначанай на пасаду асобе даецца 100 дзён на «адаптацыю», на азнаямленне са справамі, а па заканчэнні гэтага тэрміну грамадскасць мае права патрабаваць першых справаздач. Для 20 дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета 26-га склікання дэпутацтва — не terra incognita, адпаведны досвед работы ў іх ужо ёсць. Многім навічкам у дэпутацкім крэсле дапамагла асвоіцца іх асноўная пасада (больш за палову членаў гарсавета — кіраўнікі камерцыйных, дзяржаўных структур ці грамадскіх арганізацый). Аб дзейнасці Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і аб праблемах, з якімі звяртаюцца да сваіх абраннікаў жыхары сталіцы, наша размова са старшынёй гарсавета, членам Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Міхаілам САВАНОВІЧАМ.

— Міхаіл Фёдаравіч, у сельскай мясцовасці «пасрэднікам», «злучальным звяном» паміж Саветам пярвічнага ўзроўню і насельніцтвам выступае старэйшына. У буйных гарадах такую функцыю павінны выконваць камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГС). Ці спраўляюцца яны са сваімі задачамі ў Мінску і наколькі ўвогуле эфектыўны гэтыя структуры?

— Сёння ў сталіцы 36 дзейсных камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. На жаль, пакуль што яны ёсць далёка не ва ўсіх раёнах горада. Трэба разумець, што КТГС — гэта грамадскае фарміраванне, якое матэрыяльна ніяк бюджэтам не падтрымліваецца. Людзі там працуюць выключна на энтузіязме. На бліжэйшую сесію мы выносім новы праект «Палажэння аб камітэтах тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання», дзе прапануем надаць КТГСу статус юрыдычнай асобы. Заўважу: сёння гэтыя камітэты такога статусу не маюць. Складанасць у тым, што юрасобы павінны мець як мінімум кіраўніка і бухгалтара, якім трэба выплачваць заробак. А на гэта ў сённяшніх няпростых умовах у гарадскім бюджэце няма сродкаў.

— Навошта тады зацвярджаць новае Палажэнне?

— Па-першае, з часам фінансавая сітуацыя можа змяніцца ў лепшы бок і ў горада знойдуцца патрэбныя для фінансавання КТГСаў грошы. Па-другое, наяўнасць свайго банкаўскага рахунка (што прадугледжвае статус юрыдычнай асобы) пашырыць магчымасці камітэтаў у пошуках спонсарскіх уліванняў, а таксама дасць КТГСам больш самастойнасці ў вырашэнні праблем канкрэтнага мікрараёна. Пакуль што новае Палажэнне знаходзіцца ў распрацоўцы, праводзяцца кансультацыі з юрыдычнымі, фінансавымі службамі.

Разам з гарвыканкамам мы абмяркоўвалі гэтую тэму і прыйшлі да высновы, што незалежна ад фінансавай сітуацыі будзем ініцыяваць стварэнне новых КТГСаў (у азначаным кірунку будуць працаваць і дэпутаты, і мясцовыя выканаўчыя органы, і жыллёва-эксплуатацыйныя службы), паколькі гэта адзіны варыянт нармальнага ўзаемадзеяння і забеспячэння сувязі паміж насельніцтвам і дэпутатамі гарадскога Савета. Пакуль што нават у Фрунзенскім раёне, дзе КТГСы дзейнічаюць найбольш актыўна, такія камітэты ёсць далёка не ва ўсіх мікрараёнах. А так павінна быць у ідэале.

— Як атрымалася, што ўжо сёння ў адным раёне сталіцы дзейнічае некалькі КТГСаў, а ў другім няма ніводнага? Чым абумоўлена такая розніца?

— У першую чаргу гэта залежыць ад работы адміністрацыі раёна і жыллёва-эксплуатацыйных службаў, а таксама ад наяўнасці актыўных людзей з ліку мясцовых жыхароў, якія пагодзяцца ўзваліць на сябе такую нагрузку. Ды яшчэ без аплаты. Аднак практыка паказвае, што такія неабыякавыя людзі, якія імкнуцца вырашыць праблемы свайго двара, дома, мікрараёна, ёсць усюды, проста не заўсёды мы іх змаглі знайсці. А КТГСы неабходныя.

Да нас паступае вельмі шмат зваротаў грамадзян, у тым ліку і калектыўных, па пытаннях ушчыльнення забудовы. І, як правіла, органам улады даводзіцца разбірацца з сітуацыяй тады, калі ўзвядзенне спрэчнага будынка ўжо распачалося і змяніць нешта складана. А быў бы КТГС, яго члены загадзя правялі б сустрэчы з жыхарамі, абмеркавалі неабходнасць будаўніцтва аб'екта. Дзеянні камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання знялі б напружанасць, разрадзілі б сітуацыю і далі станоўчыя вынікі.

— Раскажыце, калі ласка, падрабязней — з якімі праблемамі прыходзяць мінчане да сваіх дэпутатаў? На што скардзяцца?

— Часам узнікаюць парадаксальныя сітуацыі. Напрыклад, калі я быў дэпутатам 25-га склікання, у маёй акрузе грамадзяне скардзіліся на адсутнасць крамы. Былы ваенны гарадок ва Уручча не так даўно перадалі ў камунальную ўласнасць горада, крамы там не было. Яе запраектавалі на першым паверсе новай шматпавярхоўкі, якую вырашылі размясціць паміж двума аднапад'езднымі «слупкамі», у адпаведнасці з усімі існуючымі санітарнымі нормамі. І адразу пайшлі скаргі: «Не патрэбны нам ні гэты дом, ні гэты магазін!» Людзі баяліся, што ў двор будуць заязджаць грузавыя машыны (хоць для іх там прадугледжана спецыяльная пляцоўка), што свае аўтамабілі будуць паркаваць яшчэ і пакупнікі. Карацей: адным крама была патрэбна, другім — не. І такія сітуацыі ўзнікаюць пастаянна.

Неяк да мяне на прыём прыходзілі выбаршчыкі іншай акругі наконт добраўпарадкавання іх двара. Не сакрэт, што сёння ў сталіцы парковачных месцаў недастаткова. У тым двары частку газона адвялі пад паркоўку, і некалькі чалавек былі гэтым вельмі незадаволеныя. Пры гэтым шмат нараканняў пастаянна паступае і ад аўтамабілістаў, якім няма дзе паставіць машыну. Прыходзіцца ў кожным канкрэтным выпадку шукаць «залатую сярэдзіну». Галоўнае пры гэтым — не парушаць дзейных нормаў заканадаўства.

— У сталіцы апошнім часам значна павялічыліся аб'ёмы будаўніцтва жылля. Ці паспявае за прыростам жылфонду сацыяльная інфраструктура?

— На жаль, не, хоць робіцца ў гэтым кірунку шмат. Літаральна на днях, 1 верасня, адкрылі новую школу ў мікрараёне Каменная Горка. Будаўнікам трэба выказаць асаблівую падзяку, бо работы на гэтым аб'екце пачаліся ў студзені бягучага года, і ўжо 1 верасня быў здадзены першы пускавы комплекс. Так, пэўныя дапрацоўкі там яшчэ неабходныя, але і класныя памяшканні, і харчблок ужо дзейнічаюць. 1 верасня 870 дзетак пайшлі ў новую школу. Ёсць у нас праблема і з дзіцячымі садкамі. Нягледзячы на тое, што кожны год адкрываюцца новыя, іх недахоп усё яшчэ адчуваецца. Асабліва ў новых мікрараёнах. У той жа Каменнай Горцы ў новым садку, які хутка будзе здадзены ў эксплуатацыю, на адно месца прыходзіцца 10 заяў.

— У свой час, калі ў краіне назіраўся значны дэмаграфічны спад, многія будынкі дзіцячых садкоў былі перапрафіляваныя, аддадзеныя іншым арганізацыям. Можа, прасцей і танней было б вярнуць іх назад, у сферу адукацыі?

— Па-першае, не ўсе яны размешчаны там, дзе сёння ў іх адчуваецца самая сур'ёзная патрэба. Скажам, з той жа Каменнай Горкі вазіць дзіця на вуліцу Янкі Маўра захоча не кожны, бо там няма прамой транспартнай сувязі. У новых мікрараёнах трэба будаваць новыя садкі. Па-другое, паўторная рэканструкцыя былых дзіцячых садкоў, перапрафіляваных пад іншыя ўстановы, абыдзецца значна даражэй, чым будаўніцтва новага садка. Акрамя таго, узнікне праблема з размяшчэннем тых установ і арганізацый, якія займалі плошчы былых дзіцячых садкоў. Як бачыце, ператвараць наноў такія будынкі ў садкі неэфектыўна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

За падначаленага адказа дырэктар?

Кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама патрабуе ад кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый актыўна дапамагаць сваім падначаленым выплачваць даўгі за камунальныя паслугі, паколькі Віцебшчына з'яўляецца лідарам у краіне па камунальных даўгах. Пастаўлена канкрэтная задача — даўгі выплаціць ужо да пачатку наступнага года.

Па звестках кіраўніцтва жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскай вобласці, за апошнія чатыры гады запазычанасць панізілася на 1,5 мільярда рублёў — да 6,6 млрд. У сумным спісе лідараў — Аршанскі раён (каля 346 мільёнаў рублёў), а таксама Шумілінскі, Віцебскі, Гарадоцкі і іншыя.

У асноўным даўгі маюць малазабяспечаныя, няпоўныя сем'і, ёсць і даўжнікі-пенсіянеры, інваліды... Адказныя асобы паабяцалі, што асабіста арганізуюць «хаджэнне ў народ», каб зняць праблему запазычанасці. Дарэчы, нельга сказаць, што прафілактычная інфармацыйная работа не вядзецца. Спісы даўжнікоў друкуюцца нават у СМІ. Вельмі рэдка, але прымяняецца практыка, калі даўжнікоў, якія запазычылі вельмі шмат, перасяляюць у іншыя кватэры меншай плошчы.

У ліку іншага, каб дапамагчы небагатым даўжнікам разлічыцца за камунальныя паслугі, плануецца аказваць ім адрасную сацыяльную дапамогу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗЯМЛЯ І НЕБА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

А яшчэ ў Лепельскім раёне з добры дзясятак гадоў існуе такая практыка: штомесяц на базе аднаго з сельсаветаў праходзіць своеасаблівая вучоба. Папярэдне работнікі сельвыканкама і раённых структур раз'язджаюцца па вёсках, праводзяць там падваровыя абходы ці сходы грамадзян, падчас якіх «выплываюць» праблемы, што назапасіліся ў людзей... Па выніках аб'езду ў райвыканкаме адбываецца «разбор палётаў», нявырашаныя пытанні перадаюцца адпаведным службам і застаюцца на кантролі да моманту вырашэння.

— Таму і скаргаў ад насельніцтва становіцца менш, — лічыць Уладзімір Тарасаў. — Не скажу, што ўсё ў нас так ужо ідэальна... Як і ў кожным сельсавеце, ёсць свае праблемы — і з кінутымі дамамі, і са спадчыннікамі, і з могілкамі, у якіх, я лічу, абавязкова павінен быць адзін гаспадар. Але невырашальных праблем няма... Калі ў тым жа 96-м мы не разумелі, што і як рабіць, да каго звяртацца па дапамогу, дык цяпер мы гэта ведаем дакладна, таму што ёсць сістэма. Адштурхоўваючыся ад яе, можна ўжо працаваць. А наколькі эфектыўна — залежыць ад кіраўніка сельскага Савета і яго «каманды».

Натуральна, людзі хочуць, каб іх пытанні былі вырашаныя тут і цяпер, а так не атрымліваецца — не да ўсіх старшыня адразу дабяжыць, тлумачыць Уладзімір Віктаравіч. У такіх выпадках прыходзіць на дапамогу дэпутацкі корпус, які Тарасаў называе «сапраўды дзейсным».

— Вельмі важна, калі дэпутат можа не проста «канстатаваць»: маўляў, там і там нешта не так, а здольны прапанаваць канкрэтную дапамогу ў вырашэнні пытання. Людзі нас выбралі, дык трэба варушыцца! Шчыра скажу, што нашаму сельскаму Савету ў гэтым плане пашанцавала...

Наталля КАРПЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

89-гадовая жыхарка сельсавета Матрона Афанасьеўна МАЗГО прыйшла аформіць апякунства.

ЧЫМ БОЛЬШ УВАГІ — ТЫМ БОЛЬШ ПРЭТЭНЗІЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Раскажыце пра забяспечанасць мінчан медыцынскім абслугоўваннем. Ці хапае ў горадзе паліклінік?

— Практычна кожны год у Мінску адкрываецца новая паліклініка. У першую чаргу — у новых мікрараёнах. Гэта не такое балючае пытанне, як забяспечанасць месцамі ў дзіцячых садках і школах. У большай ступені праблемай з'яўляецца недахоп медыцынскіх кадраў у паліклініках. Сёлета мы па размеркаванні пакінулі ў сталіцы ўсіх выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, бо ў нас адчуваўся востры недахоп урачоў, асабліва вузкіх спецыялістаў. Для таго, каб кадры ў нас замацоўваліся, затрымліваліся, гарадскімі ўладамі прынята рашэнне аб будаўніцтве інтэрнатаў для ўрачоў, выдзяленні ім жылля ў арэнду і інш. Адзначу, што Мінскі гарвыканкам і гарсавет падтрымліваюць не толькі медыкаў. Штогод на сесіі Мінгарсавета прымаецца рашэнне аб падтрымцы работнікаў адукацыі і аховы здароўя. За кошт бюджэту горада гэтым катэгорыям, а таксама ўчастковым інспектарам міліцыі і інспектарам па справах няпоўнагадовых выплачваюцца надбаўкі да заробку.

Між іншым, участковых інспектараў сёння ў горадзе некамплект. Акрамя таго, назіраецца дэфіцыт будаўнікоў. Сёлета ў нашых вучылішчах будаўнічага профілю быў недабор навучэнцаў. І практычна ва ўсіх гарадскіх арганізацыях будаўнічага комплексу сёння ёсць вакансіі на рабочыя спецыяльнасці. Нягледзячы на высокі ў параўнанні з настаўнікамі ці ўчастковымі інспектарамі міліцыі заробак будаўніка не кожны спакушаецца на такі хлеб. Усё ж умовы працы там складаныя. Адзінае разумнае выйсце — іх паляпшэнне. І прадастаўленне жылля. У сталіцы плануецца ўзвядзенне інтэрнатаў для будаўнікоў, што павінна паспрыяць замацаванню кадраў.

— У Мінску актыўна вядзецца жыллёвае будаўніцтва, і пры гэтым чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў застаецца салідная...

— Нягледзячы на рэкордныя тэмпы ўзвядзення жылля (летась здадзена ў эксплуатацыю 1 млн 188 тысяч квадратных метраў), сітуацыя застаецца вельмі складанай. На 1 студзеня 2010 года ў сталіцы на чарзе стаяла 267 тысяч сем'яў. Асабіста я бачу адзінае выйсце — развіццё гарадоў-спадарожнікаў і стымуляванне індывідуальнага будаўніцтва за межамі кальцавой аўтадарогі. Паверце, многія пагадзіліся б узвесці побач з горадам дамок, калі б ім выдалі льготны крэдыт. І тут мы ўпіраемся ў пытанне прадастаўлення зямлі пад забудову. Сёння існуе падзел на Мінск і Мінскі раён, а асабіста я перакананы, што даўно наспела неабходнасць аб'яднання тэрыторый. Гэта дазволіла б значна скараціць чаргу на жыллё і зрабіць больш празрыстай саму сістэму пастаноўкі на ўлік.

— Ужо сёння Мінск у «час-пік» задыхаецца ў заторах. Літаральна кожны жыхар сталіцы на сабе адчувае так званую транспартную праблему...

— На жаль, гэта так. І таму на развіццё дарожнай сеткі выдаткоўваецца вельмі шмат сродкаў. Сёння вядзецца рэканструкцыя праспекта Дзяржынскага, вуліцы Маякоўскага, вуліцы Ташкенцкай і шэрагу іншых. Праезная частка там пашырыцца да васьмі палос. Станоўчы эфект дадуць і шматузроўневыя развязкі. Першая ў краіне трохузроўневая транспартная развязка з'явіцца ў Мінску — на скрыжаванні праспектаў Дзяржынскага і Жукава. Калі мы працягнем рухацца ў гэтым кірунку — зможам выправіць сітуацыю.

— У нас штогод павялічваецца колькасць транспарту ў прыватным карыстанні, што абвастрае праблему парковак. Пры гэтым месцы на платных паркінгах грамадзяне арандуюць неахвотна з-за іх высокага кошту і працягваюць пакідаць машыны пад вокнамі, ля пад'ездаў. Якім вам бачыцца аптымальнае рашэнне гэтага пытання?

— Гэта, праўда, будзе непапулярнай мерай, але я бачыў такое падчас камандзіроўкі ў Аўстрыю. У Вене абсалютна ўсе парковачныя месцы платныя, нават калі вы паркуеце машыну ў дварах. І тады ўзнікае пытанне: калі ўсё роўна прыйдзецца заплаціць за паркоўку, то, магчыма, лепш пакінуць аўто на ўладкаванай стаянцы, дзе ёсць дах і ахова, а не пад вокнамі, ля пад'езда? Думаю, не сёння, не заўтра, але з часам мы ўсё ж прыйдзем да гэтага. Мы ўсе бачым, што робіцца сёння ў дварах. Пры тым, што ўладкаваныя камунальныя стаянкі ў сталіцы застаюцца незапоўненымі. Прывяду лічбы. У Мінску сёння маецца 87 камунальных плоскасных аўтастаянак на 24,6 тысячы месцаў, з якіх 2 350 месцаў — свабодныя. Плюс 154 аўтастаянкі іншых формаў уласнасці на 31,3 тысячы месцаў. А ў двары сёння не зайсці — усё застаўлена машынамі. У Мінску прынята і рэалізуецца праграма будаўніцтва паркінгаў. Яны неабходны, асабліва ў новых мікрараёнах, па перыметры кальцавой. Асабіста я перакананы, што трэба шукаць варыянты будаўніцтва паркінгаў і ў цэнтры горада, скажам, побач з чыгункай. І — абавязкова вырашаць пытанне патаннення кошту машына-месца.

— Як, паводле вашых назіранняў, за апошні час змянілася сацыяльная актыўнасць грамадзян?

— Чым больш увагі сталі надаваць рабоце са зваротамі грамадзян, тым больш стала ў грамадзян прэтэнзій і патрабаванняў. Тое, што людзі звяртаюцца, — гэта нармальна. Шкада толькі, што часам яны самі загадзя ведаюць, што не маюць рацыі, і ўсё роўна скардзяцца. Сёлета заканчваецца пяцігодка, заканчваецца тэрмін выканання 11 галіновых праграм, прынятых горадам (праграма развіцця адукацыі горада Мінска, праграма «Кадры», праграма развіцця аховы здароўя, развіцця пасажырскага камунальнага транспарту і г.д.). Мы павінны прааналізаваць выкананне ўсіх гэтых праграм, акрэсліць новыя планы і праграмы на наступную пяцігодку. Аб'ём работы вялікі, як у профільных службаў, так і ў дэпутатаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

БЕСПРАЦОЎЕ ў «жаночым фармаце»

Чым большы рэгіён, тым больш і варыянтаў для працаўладкавання. Немаленькі па цяперашніх мерках Вілейскі раён з 53 тысячамі насельніцтва і сапраўды нібыта цалкам пацвярджае гэта правіла — дастаткова сказаць, што сёння на аднаго беспрацоўнага тут прыпадае амаль па адной вакансіі.

Прычым з пачатку года колькасць апошніх узрасла амаль удвая. Аднак сцвярджаць, што на мясцовым рынку працы няма аніякіх праблем, таксама нельга. Статыстыка сведчыць, што больш за 70 працэнтаў беспрацоўных на Вілейшчыне — жанчыны. І гэта пры вельмі нязначным попыце на «жаночыя» працоўныя рукі.

Большасць вакансій — на вёсцы

Найбольш няпростай для раёна аказалася другая палова мінулага дзесяцігоддзя. Вынікам зніжэння попыту на прадукцыю мясцовага, па сутнасці, горадаўтваральнага прадпрыемства «Зеніт» стаў усплёск беспрацоўя, прычым здавалася, што гэтая праблема з'явілася ўсур'ёз і надоўга. Аднак сёння яна — ужо ў мінулым. Хтосьці з жыхароў Вілейкі вырашыў проста з'ехаць, нехта ўладкаваўся ў Маладзечне, Мінску ці нават у Расіі, нехта набыў новую спецыяльнасць і знайшоў сабе іншы занятак — такім чынам, напружанне на рынку працы зменшылася. Цяпер узровень беспрацоўя па райцэнтры складае амаль «стандартны» для Беларусі 1 працэнт. А ўзровень беспрацоўя ў сельскай мясцовасці — яшчэ меншы.

— У нас даволі праблематычна ўладкавацца ў арганізацыі бюджэтнай сферы, заявак ад наймальнікаў тут няшмат, а калі вакансіі і з'яўляюцца, то «закрываюцца» вельмі хутка, — распавядае галоўны спецыяліст аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Вілейскага райвыканкама Марына Стацкая. — Аднак некаторыя прапановы ўсё ж ёсць — пры жаданні можна ўладкавацца мастацкім кіраўніком ці культарганізатарам ва ўстановы культуры. Існуе стабільны попыт на працоўную сілу і ў прамысловасці — на тых жа фрэзероўшчыкаў, токараў, шліфоўшчыкаў, слесараў-інструментальшчыкаў, электрагазазваршчыкаў. Праўда, усё ж варта зрабіць адну істотную заўвагу: апошнім часам прадпрыемствам патрабуюцца не проста «людзі з вуліцы», а сапраўды кваліфікаваныя спецыялісты.

Яшчэ адной перспектыўнай з пункта гледжання ўладкавання сферай застаецца гандаль — заявак на прадаўцоў, асабліва ў сельскай мясцовасці, таксама нямала. Аднак па колькасці варыянтаў бясспрэчным лідарам з'яўляецца аграпрамысловы комплекс.

— Кола прапаноў ад прадпрыемстваў АПК даволі шырокае — ад аператараў машыннага даення і жывёлаводаў да аграномаў і ветурачоў, — працягвае Марына Стацкая. — Аднак, нягледзячы на даволі рэальныя перспектывы атрымання жылля, з запаўненнем гэтых вакансій існуюць праблемы. Бо асаблівага жадання працаваць на вёсцы, на жаль, няма. А да таго ж тут ёсць «пытанне заробкаў» — звычайна прапановы падмацоўваюцца перспектывай атрымліваць толькі 500-600 тысяч рублёў у месяц.

Малы бізнэс — яшчэ не рашэнне

Між тым тэма заробкаў была і застаецца галоўнай. Вілейскі раён абыходзіцца без масавых скарачэнняў, але ж з пачатку года па дапамогу ў службу занятасці тут звярнулася больш за 1,2 тысячы чалавек, і 645 з іх былі прызнаныя беспрацоўнымі. Пераважнай большасці гэтых зваротаў папярэднічала звальненне па ўласным жаданні.

— У сувязі з гэтым было і застанецца актуальным стварэнне новых месцаў, — адзначае Марына Стацкая. — З пачатку года ў нас з'явілася 268 новых вакансій, і ў тым ліку 155 — у малым бізнэсе. Прычым падтрымка прыватнай ініцыятывы будзе асноўнай і надалей. Але ж аднаго гэтага мала. Сёння сярод 178 беспрацоўных у раёне 131 — жанчына. А адсюль выснова: неабходна арганізоўваць спецыяльныя «жаночыя» вытворчасці.

Стаўка на «вялікую ваду»

Першы крок плануецца зрабіць ужо ў хуткім часе. У райцэнтры адчынідца буйны гандлёвы цэнтр. Тут з'явіцца магчымасць уладкаваць паўсотні чалавек — перш-наперш гаворка, вядома, пра жанчын.

— Вельмі патрэбны для Вілейкі праект і адкрыццё швейнай вытворчасці, — заўважае начальнік аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Таццяна Цітуленка. — Усе ўмовы тут нібыта ёсць: у нас вядзецца прафесійная падрыхтоўка швачак. Аднак, на жаль, пакуль гэта толькі планы. Таму ні ў якім разе нельга скідваць з рахункаў і іншыя напрамкі.

Адной з галоўных адметнасцяў Вілейшчыны заўсёды была маляўнічая прырода, у гэтым ракё не саступае суседняй «раскручанай» Мядзельшчыне. А адсюль — і перспектывы развіцця эканомікі. Тут можна зарабляць на турызме, агратурызме і рамесніцкай дзейнасці. Тым больш што Вілейшчына мае сапраўды ўнікальныя аб'екты — напрыклад, музей Першай сусветнай вайны ў вёсцы Забродзе.

— Аказанне турыстычных паслуг ніколі не абыходзіцца без жанчын, таму гэтая сфера для нас вельмі важная, — падкрэслівае Таццяна Цітуленка. — Напрацоўкі тут ёсць — на тэрыторыі раёна на шашы з Мінска на возера Нарач павінны з'явіцца прыдарожны гатэль з крамай. Аднак зразумела, што і гэтага мала. Колькасць турыстычных аб'ектаў павінна ўзрасці, аднак тут неабходна вырашыць адну праблему. Шматлікіх гасцей можа прывабіць Вілейскае вадасховішча, але на яго ўзбярэжжы фактычна забаронена будаўніцтва. Па вельмі простай прычыне — ваду з вадасховішча выкарыстоўвае сталіца, і зменіцца сітуацыя толькі тады, калі адбудзецца поўны пераход Мінска на артэзіянскія свідравіны. У выніку абмежаванні па вадасховішчы знікнуць. А што да пошуку грошай, то тут аніякіх сумненняў няма — інвестар абавязкова знойдзецца.

Сяргей ГРЫБ.

Вілейскі раён.

ДРОБЯЗЬ, А ПРЫЕМНА...

Вольга Вайцішкіна, якая сёлета пайшла ў апошні клас Церахоўскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы №1, што ў Добрушскім раёне, вельмі ўзрадавалася, прымаючы разам з іншымі старшакласнікамі падарунак у выглядзе камплекта мячоў: для валейбола, футбола, баскетбола... У іх школе, гаворыць дзяўчына, якая збіраецца стаць спецыялістам па лячэбнай фізкультуры, мячы пыліцца не будуць.

— Якраз мячоў нам і не хапала — такая добрая падтрымка нашай школе. Дзякуй вялікі! — гэта ўжо настаўнік фізкультуры Віктар Пясчанка радуецца падарунку ад дэпутатаў.

Рэч у тым, што акцыя «Дэпутацкі клопат — здароўе дзяцей» на працягу верасня праходзіць на Гомельшчыне паўсюдна. Яе арганізатар, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Марына БОНДАР кажа, што ўгаворваць не прыйшлося нікога — прапанову ўспрынялі на ўсіх узроўнях улады. Спачатку размова ішла пра адзін мяч ад дэпутацкага корпуса на школу — як сімвал пачатку канкрэтнай дзейнасці ў прапагандзе здаровага ладу жыцця. Але ж атрымаўся сапраўдны «мячавы бум».

— Здаецца, дэпутаты выбралі са складоў вобласці ўсе запасы мячоў, — пацвярджае старшыня Церахоўскага пасялковага Савета дэпутатаў Аляксандр Кузняцоў, які асабіста ездзіў купляць мячы для чатырох школ, што знаходзяцца на тэрыторыі пассавета. — Такая акцыя праходзіць у першы раз, і таму дэпутаты спачатку здзівіліся. А потым, калі размова зайшла пра адзін мяч на школу, сказалі: чаму толькі па адным, патрэбна ж больш! За гадзіну грошы сабралі. Праўда, мы пацікавіліся ў кожнай канкрэтнай школе, што ім больш патрэбна са спартыўнага інвентару. Напрыклад, адна са школ папрасіла настольны тэніс — яна гэта і атрымала. А астатнім школам дасталася па камплекце мячоў. У нашага пасялковага Савета пастаянная сувязь са школай. Разам праводзім розныя спартыўныя мерапрыемствы, школьнікі прыглядаюць за помнікамі, пахаваннямі воінаў. Некалькі клумбаў на цэнтральнай вуліцы Церахоўкі таксама замацаваныя за школьнікамі. Калі ветэранам трэба дапамагчы на прысядзібным участку, тут першая памочніца — школа.

Цяпер ва ўсіх вясковых установах адукацыі спартыўныя залы адчынены да 20 гадзін. Праўда, практычна паўсюдна не хапае неабходнага інвентару, адзначае старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Марына Бондар, якая да гэтага займала пасаду начальніка абласнога ўпраўлення адукацыі і праблемы галіны ведае як ніхто.

— Нам хацелася, каб дэпутаты павішавалі дзяцей з пачаткам навучальнага года не толькі добрымі словамі, але і справамі, — гаворыць яна. — Раней мы казалі — давайце запросім дзяцей у спартзалу, каб адарваць ад вуліцы. Сёння ёсць яшчэ адна праблема: дзіця трэба адцягнуць і ад камп'ютара, каля якога яно сядзіць суткамі. Тым больш што актуальнай становіцца такая праблема, як залішняя вага. Вось мы і вырашылі, што дэпутаты павінны працаваць у гэтым кірунку — з вучнямі, з бацькамі, з настаўнікамі. Сабралі мінімум па 5—10 мячоў на кожную школу. Такім чынам па вобласці іх атрымалася не менш за 3 тысячы.

Скарыстаўшыся прыездам старшыні аблсавета ў пасёлак, да Марыны Андрэеўны падыходзілі людзі і пыталіся: калі нарэшце вырашыцца агульная праблема ўсяго аграгарадка — з дарогамі?

— Некаторыя дарогі ў населеных пунктах пасялковага Савета былі заасфальтаваны яшчэ пры Савецкім Саюзе, — пацвярджае старшыня Церахоўскага пасялковага выканаўчага камітэта Аляксандр Кузняцоў, — таму, сапраўды, дарогі — першая праблема. Іх цяпер перадалі на баланс у КУП «Добрушскі камунальнік», але пакуль мы не адчулі нейкіх зрухаў.

Марына Бондар таксама адказная за гэтую акругу, бо ў абласны Савет выбіралася менавіта адсюль, з Добрушскага раёна. Таму лабіраваць інтарэсы мясцовых жыхароў і вырашаць праблему дэпутаты дамовіліся разам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Добрушскі раён.

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

СПРАВА ТЭХНІКІ

Уладзімір Яцкевіч працуе старшынёй Пружанскага сельскага Савета ўжо 19 гадоў. Таму добра памятае, як шматлікія даведкі, іншыя дакументы пісаліся ўручную альбо друкаваліся на машынцы.

Пазней іх набіралі на камп'ютары, але апошні выкарыстоўвалі зноў жа толькі ў якасці пішучай машынкі, а ўсемагчымыя звесткі работнік знаходзіў у пагаспадарчай кнізе альбо іншым зборніку ці сшытку. З укараненнем праграмы «Сельсавет» сітуацыя змянілася. Сёння ўся пагаспадарчая кніга — а гэта значыць, база звестак пра кожнага чалавека, склад яго сям'і, домаўладанне, прысядзібны ўчастак і падсобную гаспадарку — ёсць у электронным варыянце.

— Цяпер самыя запатрабаваныя даведкі, — расказвае Уладзімір Аляксандравіч, — гэта звесткі пра вырашчаны на прысядзібных участках ураджай. Многія вяскоўцы вязуць прадукцыю на рынак, а для законнага гандлю трэба прад'явіць адпаведны дакумент. Выдача даведкі займае літаральна хвіліны. Бо інфармацыя занесеная ў базу, дастаткова «задаць» машыне прозвішча чалавека, і ўсе астатнія звесткі яна выдасць імгненна. Супрацоўніку сельвыканкама застаецца зверыць альбо ўвесці звесткі пашпарта — і дакумент гатовы.

Але адна справа выдаць восеннюю даведкі грамадзянам, і другая — палічыць колькасць вырашчанай прадукцыі на асабістых падворках для статыстыкі. Калі б гэта рабілася ранейшымі метадамі, мы, мабыць, усім сельвыканкамам тыдзень сядзелі б, і невядома, ці справіліся б паспяхова з задачай. Цяпер жа гэта сапраўды стала справай тэхнікі.

Укараненне новых тэхналогій дазволіла эканоміць шмат часу супрацоўнікаў мясцовага органа ўлады. Спісы інвалідаў, ветэранаў, адзінокіх састарэлых грамадзян, іншых катэгорый насельніцтва вельмі часта запытваюць самыя розныя раённыя арганізацыі і ўстановы. Адным патрэбна толькі колькасная складовая названых катэгорый, другім — спіс з прозвішчамі, трэцім — з годам нараджэння людзей. Усё гэта, як вы разумееце, цяпер рыхтаваць вельмі проста.

Сакратар Шарашоўскага пасялковага Савета Галіна Карагода згадала, як раней на пачатку года да сакратара сельсавета выстройвалася чарга. Людзі стаялі пад дзвярыма, каб аднавіць даведкі для налічэння дапамогі на дзяцей.

— Такія даведкі, — гаворыць Галіна Пятроўна, — трэба браць кожны год. Для нашага пассавета з насельніцтвам амаль у 2800 чалавек гэтая праблема актуальная. Шмат бацькоў атрымліваюць штомесячныя выплаты на дзяцей. Але цяпер праблема чэргаў адпала, бо дакументы робяцца хутка і дакладна. Гэта ж датычыць усіх жыццёвых сітуацый, якія прыводзяць людзей за даведкамі. Звесткі пра шматдзетныя сем'і і адзінокіх састарэлых, памеры зямельных участкаў і ўсе аперацыі з нерухомасцю, запісы актаў грамадзянскага стану і іншыя справы, якімі займаецца сельвыканкам ва ўсіх сваіх 16 вёсках, афармляюцца на новым узроўні.

Старшыня Вялікасельскага сельскага Савета Валянціна Баган прыйшла на сваю пасаду чатыры гады таму і пачала працу... з вывучэння камп'ютара. На ранейшым месцы гэтыя навыкі былі для яе неабавязковымі. А тут Валянціна Васільеўна адчула найперш зручнасць у рабоце, бо ўся інфармацыя ў цябе пад рукой.

— Калі я прыйшла на працу ў сельскі Савет, — гаворыць Валянціна Баган, — тут якраз пачыналася ўкараненне камп'ютарнай праграмы. Камп'ютар з базай звестак стаяў у сакратара, і я пачала з пошукаў сродкаў на другі камп'ютар. Бо нават падрыхтавацца да ўласнага выступлення на сесіі, правесці аналіз тых ці іншых працэсаў, тэндэнцый вясковага жыцця цяпер проста немагчыма без электроннага памочніка. Важнасць гэтай тэхнікі мы яшчэ раз адчулі ў працэсе аб'яднання тэрыторый. З 1 студзеня да нашага Вялікасельскага далучылі Старавольскі сельсавет. Мы атрымалі дадаткова пяць вёсак і гатовую базу звестак па гэтай тэрыторыі. Для зручнасці людзей ў Стараволі пакінулі аднаго супрацоўніка сельвыканкама для выдачы даведак, для падтрымання больш аператыўнай сувязі з жыхарамі вёсак. Хіба магчыма было б выдаваць даведкі там, калі ўся неабходная дакументацыя пераехала ў цэнтр сельсавета? Вядома, не. А так абышліся без праблем.

Перавагі ўсеагульнай камп'ютарызацыі сельскіх Саветаў відавочныя. Усе мае суразмоўцы казалі ў адзін голас, што праграма «Сельсавет» добрая, а тое, што спецыялісты яе развіваюць і удасканальваюць, яшчэ лепш. Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч таксама назваў пераход мясцовых органаў улады на камп'ютары вялікім крокам наперад.

— Цяпер уся краіна паспяхова карыстаецца згаданай праграмай, — кажа Віктар Макарэвіч. — А пачыналася яе ўкараненне менавіта ў раёнах нашай вобласці. З пераходам на камп'ютары адышлі ў гісторыю многія і многія працаёмкія аперацыі. Ну, напрыклад, штогадовы падлік сельгаспрадукцыі, вырашчанай на ўласных падворках, выклікаў часам нават матэматычныя цяжкасці. Аддзелы статыстыкі, як вядома, патрабуюць дакладную інфармацыю. За любыя скажэнні, памылкі ў справаздачнасці маглі аштрафаваць супрацоўнікаў сельвыканкама. І такое бывала. А сакратары мясцовых органаў улады ў большасці сваёй не маюць бухгалтарскай адукацыі, каб бездакорна правесці ўсе падлікі. Таму і здараліся збоі, выкліканыя тэхнічнымі прычынамі. Цяпер жа камп'ютары не памыляюцца.

Яны толькі перыядычна псуюцца, выходзяць са строю. І гэта выклікала пэўныя складанасці, асабліва напачатку. Пакуль не была адладжана сістэма абслугоўвання, работнікі сельвыканкама вазілі машыны ў рамонт сваякам, знаёмым і знаёмым знаёмых. Вядома, гэта несла ў сабе пэўную небяспеку. Бо счытаць інфармацыю з цвёрдага дыска для спецыяліста — задача простая. А на дысках часта ўтрымліваецца інфармацыя канфідэнцыйнага характару. Ды тыя ж спісы грамадзян з поўным адрасам, датамі нараджэння ў руках зламыснікаў могуць аказацца інструментам для правядзення пэўных злачынных дзеянняў. Гэтае пытанне аднойчы ўздымалася на нашых штоквартальных сходах, якія праводзіць губернатар з усімі старшынямі сельскіх Саветаў. Тады ж было прынята рашэнне праводзіць абслугоўванне тэхнікі сельвыканкамаў толькі сваімі спецыялістамі. Зараз у нас у раёне гэтым займаюцца два праграмісты. Па заяўках яны выязджаюць у любы сельсавет.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

СТАБІЛІЗАЦЫЯ НА ЗІМУ

Магілёўскі аблвыканкам у чарговы раз за гэты год разгледзеў выкананне праграмы развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак і прызнаў працу ў гэтым кірунку пакуль недастатковай.

Старшыня аблвыканкама Пётр РУДНІК нагадаў пазіцыю кіраўніка дзяржавы: нельга крыўдзіць людзей, якія трымаюць падсобныя гаспадаркі. Гэта пераважна вясковыя пенсіянеры, якія ніколі не маглі пахваліцца заможнасцю, а цяпер тым болей маюць патрэбу ў падтрымцы.

У кожным сельскім раёне ў райвыканкамах павінны з'явіцца асобы, адказныя за развіццё асабістых гаспадарак. На адну карову трэба выдзеліць не меней за гектар пашы. Для сялян павінны працаваць пункты пракату, дзе можна было б без праблем узяць на час неабходную для працы тэхніку. Малаказборшчыкі ад насельніцтва павінны быць забяспечаны ўсёй неабходнай экіпіроўкай.

Для здатчыкаў малака будзе аб'яўлена абласное спаборніцтва, пераможцы якога будуць атрымліваць грашовыя прэміі. Але сам працэс збору малака пакуль арганізаваны небездакорна, таму скаргі, прызнаюць у камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні, усё яшчэ паступаюць ад людзей.

Закуп малака ў насельніцтва паменшыўся ў параўнанні з леташнім амаль на чвэрць. Гэта тлумачаць скарачэннем пагалоўя, старэннем сельскага насельніцтва. Але ўсё ж колькасць малака памяншаецца больш імкліва, чым скарачаецца статак. Таму Пётр Руднік заклікаў улады на месцах працаваць з людзьмі, ствараць для развіцця іх уласных гаспадарак належныя ўмовы. Раёны, якія значна адстаюць ад леташніх паказчыкаў па зборы малака, бяруцца іх аднавіць да канца года.

Усё, што выраблена і вырашчана ў сельскіх падсобных гаспадарках, дзяржава можа і хоча набыць. Тым больш сёлета, калі аб'ёмы закладкі гародніны ў стабілізацыйны харчовы фонд, які робіцца на халодны сезон, павялічацца на 10-15 %. На гэтым настойвае кіраўнік вобласці. Пётр Руднік лічыць, што не выключаны вываз бульбы і гародніны за мяжу ў сувязі з неўраджаем у суседняй краіне.

Таму ўлады вырашылі стварыць запас, каб найперш забяспечыць харчамі насельніцтва сваёй Магілёўскай вобласці, а ў будучыні, калі нешта застанецца ў сховішчах, выгадна прадаць. Увогуле ў стабілізацыйны фонд мяркуецца закласці, паводле афіцыйных звестак, 16 тысяч тон бульбы, агародніны і садавіны.

Для захоўвання будуць задзейнічаны сховішчы аблспажыўсаюза, прадпрыемстваў гандлю і буйных сельскіх гаспадарак. Праўда, не ва ўсіх сельскіх раёнах такія сховішчы ёсць, таму ў будучым годзе мяркуецца пабудаваць сучасныя збудаванні для захоўвання ўраджаю.

У агульным «пірагу» будзе і доля асабістых падсобных гаспадарак: спажывецкая кааперацыя сёлета закупіла ў насельніцтва больш бульбы, мяса, мёду, гародніны і садавіны. З іншага боку, значна больш прадала прыватным асобам сродкаў абароны раслінаў і насення.

Стабілізацыйны фонд павінен быць створаны тэрмінова, а вось людзі могуць набыць бульбу, гародніну, яблыкі і ўсё астатняе на шматлікіх восеньскіх кірмашах, сезон якіх распачынаецца на Магілёўшчыне.

Ілона ІВАНОВА.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫКАРЫСТАЎСКІХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»
Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.
Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Гіпертонікам на заметку

ЛЕКАВЫЯ КАНІКУЛЫ АДМЯНЯЮЦЦА!

Шмат у каго ўзнікае пытанне, чаму трэба дакладна выконваць рэкамендацыі ўрача. Чаму, калі наступіла паляпшэнне, неабходна працягваць прыём прэпаратаў у агаворанай дазіроўцы? Ці не пашкодзіць гэта здароўю?

Па-першае, пераживаць вам няма за што. Мноства людзей ва ўсім свеце штодня прымае лекі, і гэта не прыводзіць да страты працаздольнасці або зніжэння якасці іх жыцця.

Па-другое, сістэматычны прыём прэпаратаў істотна зніжае рызыку ўзнікнення інфарктаў і інсультаў на фоне гіпертанічнай хваробы. Варта яшчэ раз адзначыць, што высокі ціск павышае верагоднасць развіцця названых ускладненняў.

Па-трэцяе, ніколі не займайцеся самастойнай карэкціроўкай лекавага курсу. Гэта датычыцца і дазіровак, і частаты, і працягласці прыёму. Рэч у тым, што некаторыя прэпараты пры іх адмене або няправільным прымяненні (клафелін, напрыклад) даюць адваротны эфект, і ціск можа пачаць бескантрольна падымацца. Таму змяненне прыёму аднаго з іх можа выклікаць непажаданыя пабочныя эфекты з боку іншага.

ЦІ ХАДЗІЦЬ У ЛАЗНЮ ГІПЕРТОНІКУ?

Пагроза ўзнікнення сур'ёзных адмоўных рэакцый і цяжкіх наступстваў у выніку самавольнага і бескантрольнага карыстання лазняй людзьмі з парушэннямі дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы прымусіла вучоных распрацаваць спецыяльныя правілы.

У іх падкрэсліваецца, што карыстанне парылкай дапускаецца, галоўным чынам, здаровым людзям, астатнія ж, хто мае якія-небудзь адхіленні ў стане здароўя, могуць наведваць парныя і саўны толькі з ведама свайго ўрача пад пастаянным медыцынскім кантролем за іх здароўем.

Тэмпература ў парных пры вільготнасці паветра больш за 80 % не павінна перавышаць 50 градусаў, а ў саўне пры вільготнасці 10—15 % — не больш за 60—90 градусаў. Пры першым наведванні працягласць знаходжання ў парыльным аддзяленні для здаровых асобаў абмяжоўваецца 5—8 хвілінамі, для хворых — назначэннем урача. Пасля знаходжання ў парылцы абавязкова адпачніце на працягу 30—50 хвілін, седзячы або лежачы, у памяшканні, якое добра праветрываецца.

Выключна небяспечна карыстацца парыльняй у нецвярозым стане, сытна пад'еўшы, у стане моцнай стомленасці. На думку многіх даследчыкаў, саўна аказвае гіпатэнзіўнае дзеянне ў хворых на артэрыяльную гіпертанію, але пры гэтым можа павялічвацца вязкасць крыві і агрэгацыя трамбацытаў, інакш кажучы, адбываецца «згушчэнне крыві», што можа ўяўляць некаторую пагрозу пры спадарожным атэрасклерозе.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ЛІХАМАНКА ЗАХОДНЯГА НІЛА — ІНФЕКЦЫЯ ЗУСІМ БЛІЗКАЯ

ЛІХАМАНКА Заходняга Ніла апошнія месяцы не пакідае стужкі інфармацыйных агенцтваў. З пачатку ліпеня па 31 жніўня на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі быў зарэгістраваны 231 лабараторна пацверджаны выпадак ліхаманкі Заходняга Ніла, у тым ліку 6 смяротных. Самая вялікая колькасць інфіцыяваных (87 працэнтаў ад агульнай колькасці) была выяўлена ў Валгаградскай вобласці. Пры гэтым арэал распаўсюджвання інфекцыі ахоплівае 12 раёнаў вобласці. 30 захварэлых былі выяўлены ў Растоўскай вобласці, асобныя выпадкі інфекцыі фіксаваліся на працягу лета ў Астраханскай і Варонежскай абласцях, у Краснадарскім краі і Калмыкіі. Расіяне ў паніцы. Адкуль у іх з'явілася інфекцыя з такой экзатычнай назвай? Трэба сказаць, што прыкладна 10 гадоў таму такія ж панічныя настроі, выкліканыя наступам новай інфекцыі, ахапілі і жыхароў Еўропы.

Між іншым, навукоўцам вірус ліхаманкі Заходняга Ніла вядомы ўжо даволі даўно: упершыню ён быў выдзелены ў крыві хворай жанчыны, якая пражывала ў вытоках Ніла, яшчэ ў 1937 годзе. Адсюль пайшла і яго назва. Ліхаманка Заходняга Ніла (ЛЗН) — гэта прыродна-ачаговая арбавірусная інфекцыя. Прасцей кажучы, інфекцыя, якая перадаецца праз укус членістаногіх, у асноўным крывасосных камароў, і якая цяжка паддаецца эпідэміялагічнаму кантролю. Пры дапамозе пералётных птушак вірус ЛЗН здольны пераносіцца на вялікія адлегласці, таму ён паспяхова асвоіў ужо не толькі афрыканскі кантынент, але і краіны Азіі, Еўропы, Амерыкі. У ЗША ліхаманка Заходняга Ніла ахапіла ў 1999 годзе такі мегаполіс як Нью-Ёрк і яго наваколле, а крыніцай распаўсюджвання інфекцыі сталі камары.

Беларусы здзівяцца, напэўна, яшчэ больш за расіян, але вірус ліхаманкі Заходняга Ніла выдзяляецца штогод таксама і ў камароў на тэрыторыі Беларусі. Першая экспедыцыя па выяўленні невядомых раней арбавірусаў была арганізаваная Беларускім навукова-даследчым інстытутам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі яшчэ напрыканцы 60-х гадоў XX стагоддзя. Але ў той час была навукова ўстаноўленая цыркуляцыя на тэрыторыі нашай краіны толькі віруса клешчавага энцэфаліту, хоць у суседніх краінах (Польшчы, Літве, Украіне) выдзяляліся ўжо і іншыя арбавірусы. А першы штам віруса ЛЗН быў атрыманы толькі ў 1985 годзе пры даследаванні ўнутраных органаў пералётных птушак: усяго былі даследаваныя 62 біяпробы, здабытыя ўздоўж штучных вадаёмаў рыбгаса «Трэмля», што ў Петрыкаўскім раёне. Пазней штам віруса ЛЗН быў выдзелены ў камароў роду Aedes, адлоўленых на тэрыторыі Белавежскай пушчы, і ў крыві хворага, які таксама пражываў на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

Паколькі вірус ліхаманкі Заходняга Ніла цеплалюбівы, то ў нашай краіне Гомельская і Брэсцкая вобласці з'яўляюцца найбольш спрыяльнай кліматычнай зонай для цыркуляцыі там віруса ЛЗН. На тым жа Беларускім Палессі маюцца ўсе ўмовы для стварэння там стабільных прыродных ачагоў ліхаманкі Заходняга Ніла. Хоць у зону цыркуляцыі віруса ЛЗН уваходзіць уся тэрыторыя Беларусі, спецыялісты сцвярджаюць, што прычын для панікі ў беларусаў няма, але і недаацэньваць небяспеку нельга, бо камары-разносчыкі віруса ЛЗН жывуць у непасрэднай блізкасці ад чалавека: месцамі іх размнажэння становяцца прыбярэжныя забалочанасці рэк, прыродныя і штучныя вадаёмы, якія стварае чалавек (ямы, канавы, кар'еры, цыстэрны, бочкі з дажджавой вадой, падвалы жылых будынкаў, хлявы і свірны).

Зразумела, што ёсць у Беларусі і людзі, якія перахварэлі на «афрыканскую» ліхаманку, не пакідаючы яе межаў. Антыцелы да віруса ЛЗН выяўляліся ў крыві жыхароў усіх абласцей Беларусі. Але для таго, каб паставіць такі дыягназ, неабходна лабараторна яго пацвердзіць. Увогуле большасць арбавірусных інфекцый праходзяць у медыцынскай справаздачнасці пад іншымі дыягназамі — «вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя», «неўрыт тварнага нерва», «пнеўманія», «серозны менінгіт» і г.д., паколькі іх клінічная карціна сцёртая, а сімптомы ЛЗН нагадваюць сімптомы прастуды. Па сучасных звестках каля 80 працэнтаў выпадкаў інфіцыявання ЛЗН працякаюць увогуле бессімптомна або ў лёгкай форме, таму рэальная колькасць інфіцыяваных у той жа Валгаградскай вобласці невядомая. І толькі каля 20 працэнтаў людзей праз 3-14 дзён пасля ўкусу інфіцыяванага камара адчуваюць пад'ём температуры цела, дрыжыкі, галаўныя, мышачныя і сустаўныя болі. Зрэдку да гэтых сімптомаў далучаюцца млоснасць і ваніты, у хворых павялічваюцца лімфатычныя вузлы, а на целе з'яўляецца сыпка. Чалавек адчувае сябе як пры захворванні на грып ці іншыя вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі. Такі стан можа доўжыцца ад некалькі дзён да (радзей) некалькіх тыдняў, пасля чаго паступова знікае.

Толькі ў аднаго з прыкладна 150 інфіцыяваных вірус пранікае ў цэнтральную нервовую сістэму з развіццём так званай нейраінвазіўнай формы захворвання. Пры гэтым можа пашкоджвацца як сам мозг (энцэфаліт), так і яго абалонкі (менінгіт). Пры гэтай форме інфекцыі моцная гарачка суправаджаецца выражанымі неўралагічнымі сімптомамі, інтэнсіўным галаўным болем, дэзарыентацыяй, мышачнай слабасцю, сутаргамі, зніжэннем адчувальнасці, парушэннямі свядомасці аж да комы. Зрэдку — пашкоджаннем сасудзістай абалонкі і сятчаткі вачэй аж да поўнай страты зроку.

На жаль, але пры інфіцыяванні ЛЗН магчымы і лятальны зыход. Цяжкасць працякання хваробы і лятальнасць напрамую залежаць ад узросту чалавека і стану яго імуннай сістэмы. Па звестках Расспажыўнагляда, большасць захварэлых на ліхаманку Заходняга Ніла ў гэтым годзе звязваюць сваё інфіцыяванне з працай на прысядзібным участку або з адпачынкам на прыродзе. Дзяржаўны санітарны ўрач Расійскай Федэрацыі Генадзь Анішчанка звязаў успышку ліхаманкі Заходняга Ніла гэтага года з анамальна цёплым надвор'ем, якое стварыла спрыяльныя ўмовы для размнажэння камароў — пераносчыкаў віруса. Адразу пасля ўспышкі валгаградская абласная санэпідслужба пачала рапартаваць аб дэзінсекцыі вадаёмаў і затопленых падвалаў, што дапамагло знізіць колькасць камароў, якая цяпер ужо не перавышае шматгадовыя паказчыкі.

Аднак паколькі пацяпленне клімату назіраецца ўжо не першы год, а камары пераносяць не толькі вірус ліхаманкі Заходняга Ніла, то ў прафілактыцы «камарыных інфекцый» насельніцтву трэба спадзявацца і на ўласныя сілы. Галоўная прафілактыка заключаецца ў зніжэнні кантакту з крывасмокамі. Для гэтага трэба рэгулярна апрацоўваць адкрытыя ўчасткі цела рэпелентамі, а на вокнах і фортках устанавіць маскітныя сеткі. Акрамя таго, уладальнікі загарадных участкаў могуць дапамагчы скарачыць колькасць камароў, лічынкі якіх пладзяцца ў стаячай вадзе. Для гэтага трэба трымаць басейны, бочкі і іншыя ёмістасці з вадой закрытымі, не дапускаць на сваіх участках працяглага існавання лужын і своечасова прачышчаць вадасцёкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дзіцячая тэма

Цяжкая справа — пачаць школьнае жыццё...

Ці ведаеце вы, што нашы малыя сталеюць гэтаксама хутка, як мы старэем. Яны становяцца больш дапытлівымі і скрытнымі, асабліва гэта датычыцца сямігадовых дзяцей. Уступіўшы ў новую фазу сталення, яны, натуральна, адчуваюць сябе не зусім камфортна, бо пачынаюць больш давяраць не сваёй любімай маме або бабулі, а аднакласнікам і першай настаўніцы. Гэта цалкам заканамерны фізіялагічны працэс.

Тыя бацькі, якія разумеюць гэта і не абмяжоўваюць дзіця, вылучаючы толькі свой аўтарытэт, не сустракаюць узаемаразумення з дзіцем. Аднак бываюць выпадкі, калі бацькі не могуць наладзіць стасункі са сваім дзіцем, якое стала больш дарослым. У такім разе варта звярнуцца да спецыяліста. Парады псіхолага бацькам першакласнікаў дапамогуць не толькі знайсці агульную мову з імі, але і адноўіць даверныя адносіны.

Вельмі важна, каб так званы крызіс сямі гадоў не зацягнуўся надоўга. Для гэтага бацькам трэба быць надзвычай уважлівымі не толькі да паводзінаў свайго дзіцяці, але і да сваіх учынкаў.

НАЙБОЛЬШ ПРОСТЫЯ І ЛЁГКА ВЫКАНАЛЬНЫЯ ПАРАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ:

- не варта навязваць сваё меркаванне ў дачыненні да новых сяброў, тым больш, калі яно адмоўнае, трэба паспрабаваць зразумець, чаму дзіця выбрала сяброўства з дрэннымі аднагодкамі, а не з добрымі;
- непажадана ўваходзіць у пакой без стуку, бо дзіця хоча быць гаспадаром у сваёй «прасторы», а не госцем;
- не абмяжоўвайце дзіця ў выбары гуртка па інтарэсах. Няхай лепш яно паходзіць месяц і само зразумее, што яму гэта не падабаецца, чым пасля 3—5 гадоў наведвання вамі выбранага гуртка высветліцца, што яно не пераносіла той род дзейнасці, якім займалася гэтулькі гадоў;
- заахвочвайце яго дасягненні, але не захвальвайце, інакш яго самаацэнка можа стаць занадта завышанай;
- дапамажыце яму адчуваць сябе свабодным, але пры гэтым раскажыце, што дазволена, а што не;
- не ўмешвайцеся ў справу, якой заняты ваш першакласнік, калі ён не просіць дапамогі;
- не параўноўвайце хлопчыкаў і дзяўчынак, не стаўце адных у прыклад другім: яны розныя нават па біялагічным узросце — дзяўчынкі звычайна старэйшыя за аднагодкаў-хлопчыкаў; не забывайце, што хлопчыкі і дзяўчынкі па-рознаму бачаць, чуюць, па-рознаму ўспрымаюць прастору і арыентуюцца ў ёй, а галоўнае — па-рознаму асэнсоўваюць усё, з чым сутыкаюцца ў гэтым свеце;
- паступова, але няўхільна знімайце з сябе клопат і адказнасць за асабістыя справы дзіцяці і перадавайце іх яму;
- не бойцеся паказаць сваю «слабасць», паскардзіўшыся на стомленасць або дрэннае самаадчуванне. Дайце дзіцяці магчымасць падагляджаць вас, праявіць клопат і ўвагу;
- дазваляйце дзіцяці адчуць адмоўныя наступствы сваіх дзеянняў (або сваёй бяздзейнасці). Толькі тады яно будзе сталець і станавіцца «свядомым».

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 15 октября 2010 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний, 2-й этаж)

На аукцион будет выставлен: земельный участок с кадастровым номером 221089204601000016, расположенный по адресу: Витебская область, Верхнедвинский р-н, Чапаевский с/с, д. Залучье У-1, площадью 0,2049 га, для размещения базы промыслового лова рыбы, срок аренды – 99 лет, начальная цена предмета аукциона – 33 506 рублей, размер задатка – 3 300 рублей.

Условия продажи: внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; заключение победителем аукциона с Верхнедвинским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок со дня получения решения (выписки из решения) о предоставлении ему земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица (далее – участники). Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе, заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, в комиссию **представляются:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 10 сентября по 11 октября 2010 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 15 октября 2010 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Сумма задатка перечисляется на р/счет 3641313000610 в ЦБУ № 206 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцка, МФО 660. Получатель – Верхнедвинский райисполком. УНП 300063038. Назначение платежа 04002.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Инженерные коммуникации на земельном участке отсутствуют.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по размещению настоящего извещения в СМИ.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Контактный телефон в г. Верхнедвинске: 8 (02151) 5 28 97.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Малоритский район, дер. Луково, ул. Мокранская, д. 4
Продавец недвижимого имущества	РУППС «Белпочта», тел. 8(0162) 20 57 21
Сведения о предмете аукциона	Капитальное строение (отделение почтовой связи с пристройкой и верандой, сараем, уборной) общей площадью 116,4 кв.м, 1 эт., сборно-щитовое, г.п. 1976. Земельный участок площадью 0,0886 га, использовать для обслуживания объекта коммунального производства, размещения общественного питания, торговли, услуг и других целей, не запрещенных законодательством с соблюдением природоохранных, экологических, противопожарных и других условий; срок аренды – 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	40 259 059
Сумма задатка, руб.	4 025 900
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by*

Аукцион состоится 12 октября 2010 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 11.10.10 г. включительно.
3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.
4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.
5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.
6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 11 октября 2010 года включительно.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (Продавец)

проводит открытый аукцион по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

лот № 1 — земельный участок в агрогородке Раков, участок № 92 площадью 0,2372 гектара, кадастровый номер участка 622085715632000139, начальная цена 23 720 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод), в населенном пункте имеется газ;

лот № 2 — земельный участок в д. Дубоши, площадью 0,1561 га, кадастровый номер 622085705601000043, начальная цена 3 902 500 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **15 октября 2010 года в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 11 октября 2010 года (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 140 54 37.

222365, Раковский сельский исполнительный комитет.

Минская область, Воложинский район, агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11.

р/с 3604060502122 в ЦБУ № 605 г. Воложина ф-л № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601.

г. Воложин, ул. Партизанская, 13

УНП 600037384, ОКПО 04432323.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже объектов республиканской собственности – капитальных строений и права заключения договоров аренды земельных участков, изолированных помещений

Лот № 1 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 420/С-30936, инв. № 420/С-30937, инв. № 420/С-30938, инв. № 420/С-30939, инв. № 420/С-30337, инв. № 420/С-30338, инв. № 420/С-30340, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, 51, здание хранилища техники южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000023 площадью 1,4618 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 171 605 055 руб., сумма задатка – 17 160 000 руб.
Лот № 2 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 420/С-31498, инв. № 420/С-31496, инв. № 420/С-31497, инв. № 420/С-32179, многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000006 площадью 2,5797 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 1 151 081 920 руб., сумма задатка – 115 108 000 руб.
Продавец недвижимого имущества **по лотам 1, 2:** Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил»	
Лот № 3 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 10 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 134 208 242 руб., сумма задатка – 13 420 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь
Лот № 4 Предмет аукциона, место нахождения имущества	Изолированное помещение инв. № 441/D-1136, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Трабы, ул. Советская, д. 35а-1
	Начальная цена предмета аукциона – 8 389 724 руб., сумма задатка – 838 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация»
Лот № 5 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 441/С-443, инв. № 441/С-9520, инв. № 441/С-9521, инв. № 441/С-9524, расположенные по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, дер. Геранены, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422980702601000232 площадью 0,2848 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 134 377 457 руб., сумма задатка – 13 437 000 руб.
Лот № 6 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 452/С-180, инв. № 452/С-181, инв. № 452/С-182, инв. № 452/С-183, инв. № 452/С-184, инв. № 452/С-5501, инв. № 452/С-5503, инв. № 452/С-5504, инв. № 452/С-5505, инв. № 452/С-5506, инв. № 452/С-5507, инв. № 452/С-5508, инв. № 452/С-5509, инв. № 452/С-5510, инв. № 452/С-5511, инв. № 452/С-5518, оборудование, расположенные по адресу: Гродненская обл., г.п. Зельва, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422655100000000158 площадью 5,3514 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 158 733 129 руб., сумма задатка – 15 873 000 руб.
Лот № 7 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение инв. № 422/С-430, расположенное по адресу: Гродненская обл., г.п. Островец, ул. Ленинская, д. 77, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 424655100001001581 площадью 0,0054 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 1 084 507 руб., сумма задатка – 108 400 руб.
Лот № 8 Предмет аукциона, место нахождения имущества	Изолированное помещение инв. № 442/D-133, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г.п. Островец, ул. Ленинская, д. 77
	Начальная цена предмета аукциона – 15 657 761 руб., сумма задатка – 1 565 000 руб.
Продавец недвижимого имущества **по лотам 5, 6, 7, 8:** Республиканское унитарное предприятие «Белорусский радиотелевизионный передающий центр»	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **20 сентября 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 16 сентября 2010 года до 13.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. **По лотам 1, 2, 3, 5, 6, 7:** Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

4. **По лотам 4, 8**: Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2 рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

Малюнкі на чашы-карцы XVI ст. (музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах).

«...праз гэта Сіта Бог прасеяў зярнятак жыта»

Адзін з прынцыпаў надання назвы бачным астранамічным аб'ектам, які выкарыстоўвалі нашы продкі, — асацыятыўны. Напрыклад, **па знешнім падабенстве з пэўнымі прыладамі побыту Вялікую Мядзведзіцу называлі Чарпаком, Апалонічкам, Коўшыкам, Чашай ці Каструляй; Плеяды — Сітам ці Рэшатам, пояс Арыёна — Каромыслам («гэта дзеўка ваду каромыслам нясе»). Па асацыяцыі з транспартнымі сродкамі тую ж Вялікую Мядзведзіцу называлі Вазком, Карэтай, Каляскоцай, Брычкай, Калёсамі і інш.**

— На тэрыторыі Цэнтральнай, Паўночнай, Паўночна-Усходняй і Паўночна-Заходняй Беларусі для вызначэння сузор'я Плеяды існавала назва Сіта. Насамрэч, гэта не славянскае, а хутчэй балцкае слова. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што да балтаў яно прыйшло ад фіна-ўгорскіх плямёнаў. Славуты беларускі фальклярыст Аляксандр Сержпутоўскі, напрыклад, запісаў, што Сіта — гэта тое месца, дзе адсейваюцца праведныя душы ад грэшных. Адам Міцкевіч так апісваў народныя вераванні: «...праз гэта Сіта Бог прасеяў зярнятак жыта». А ў палякаў і літоўцаў захавалася паданне, нібыта гэта тое сіта, якім сеяла Панна Марыя, а потым, на свята Успення, павесіла сярод зорак.

Карэтай ці Возам Вялікую Мядзведзіцу маглі назваць з-за яе перамяшчэння па небе на працягу сутак вакол Зорнага Кала (Палярнай зоркі). Ёсць меркаванне, што назва Зорны Кол прыйшла на тэрыторыю Беларусі ад татараў. Татары верылі, што да Зорнага Кала прывязаны Конь (Вялікая Мядзведзіца), які ходзіць кругам па небе. Між іншым, у беларусаў гэтае сузор'е таксама часам называлі Канём ці Канём з коламі.

Другі прынцып надання назваў нябесным целам — антрапаморфны («адушаўленне»), які грунтуецца на міфалогіі. Многія астранамічныя аб'екты ўспрымаліся нашымі продкамі ў вобразе людзей ці багоў. Напрыклад, Заранка (Венера) была багіняй. Сюды ж можна аднесці такія назвы, як Тры Каралі, Тры Сястры, Тры Браты, Тры Касцы (тры зоркі пояса Арыёна). «Тры зоркі стаяць, як касцы, калі косяць на полі», — гаварылі людзі.

— Радзей сустракаюцца анімалістычныя («жывёльныя») назвы, — распавёў навуковец. — Напрыклад, Заранку (Венеру) называлі Звярынай зоркай. Часам на вёсках кажуць, што ёсць на небе Вуж, Вужакі, Чарвякі, але дакладна невядома, да якой зоркі ці сузор'я прымянялі гэтыя назвы. Беларускі этнограф Зміцер Канаплянікаў выказаў версію, што так называлі зоркі, якія мігцелі з-за нестабільнасці атмасферы.

Толькі ў адным месцы мне патрапілася ў якасці азначэння сузор'я Вялікай Мядзведзіцы назва Лось. Тут не трэба намагацца ўбачыць у абрысе сузор'я вобраз сахатага. Для тагачаснага чалавека галоўным магло быць не знешняе падабенства, а цэласнасць карціны і сувязь са штодзённым жыццём. Калі ў трох зорках пояса Арыёна яны бачылі трох паляўнічых і самі хадзілі на паляванне ўтрох за адным аб'ектам (скажам, Ласём), то і на небе Вялікую Мядзведзіцу называлі Ласём. Для паўнаты карціны.

Пэўныя назвы зорак і сузор'яў у нашых продкаў мелі дачыненне да пэўных святаў. Напрыклад, назва Воз звязана з уяўленнем беларусаў пра Каляду, якая на ім прыязджае на свята (з калядных песень: «Прыехала Каляда на сівенькім вазочку»).

— Цікава, — дадаў навуковец, — што падчас свята Калядаў (25 снежня па старым стылі) прыблізна апоўначы дышла зорнага Воза ўтварае прамую лінію «ўсход — дышла — захад», ці, як гаварылі ў народзе: «Воз перавёрнуты дагары нагамі».

Значную ролю ў фарміраванні поглядаў на назвы адыграла хрысціянства. Вялікую Мядзведзіцу яшчэ называлі Аляшова Павозачка, ці Іллёў Воз (воз, у якім ездзіць святы Ілля зорнаю дарогаю — Млечным Шляхам). Падчас свята гэтага святога (20 ліпеня па старым стылі) роўна апоўначы Вялікая Мядзведзіца размешчана паралельна гарызонту. Гэтае пэўнае становішча Воза ў пэўны час на небе магло сімвалізаваць наступленне свята. Беларусы і іншыя хрысціянскія народы ўяўлялі Ілью на небе ў вогненнай калясніцы, запрэжанай чатырма крылатымі коньмі («Ілля — заведацель над Перуном; ён у вогненнай калясніцы ездзя па небу...»). А як вядома, з прыходам хрысціянства на святога прарока Ілью было перанесена большасць функцый ды атрыбутаў паганскага бога Перуна. Тады можна дапусціць, лічыць Авілін, што раней назвы Вялікай Мядзведзіцы былі звязаны менавіта з гэтым богам.

— На поўначы Беларусі з'яўленне на небасхіле трох зорак пояса Арыёна, якія называлі Трыма Каралямі, сімвалізуе пачатак свята Вадохрышча... У больш познія часы неабходнасць у дакладным вызначэнні месца размяшчэння зорак на небе знікла, усе астралагічныя веды страцілі сваю прагматычнасць і набылі больш сімвалічны характар.

Птушыная Дарога

Бадай што ўсе народы свету прыдумвалі для Млечнага Шляху свае паэтычныя назвы і звязаныя з ім легенды.

— Па Млечным Шляху ў старажытнасці вызначалі дарогу, бо ў розныя поры года ён па-рознаму накіраваны, — патлумачыў навуковец, — таму на поўдні Беларусі сустракаецца такая яго назва, як Чумацкі Шлях (чумакі — гэта гандляры, якія на валах перавозілі соль і па зорным небе вызначалі дарогу). Але больш распаўсюджаная на тэрыторыі Беларусі назва Млечнага Шляху — Птушыная, ці Гусіная Дарога. Па ёй птушкі ляцелі ў вырай. Кажуць, што гэтую дарогу на небе для іх стварыў Бог, каб птушкі не губляліся, калі ляцяць у вырай. Продкі верылі, што душа чалавека пасля смерці становіцца птушкай і па гэтай Птушынай Дарозе адлятае ў іншы свет. З распаўсюджваннем хрысціянства Млечны Шлях сталі называць Дарогай на Іерусалім, Святой Дарогай, па якой ходзіць Бог і святыя. На Стаўбцоўшчыне зафіксавана наступнае паданне, звязанае з малаком: «Маладая дзяўчына-сірата несла малако сваім сястрычкам і братам, якое зарабіла ў людзей, і разліла яго. Так з'явіўся Малочны Шлях, а яе слёзы — зоркі гэтага шляху». Гэта, хутчэй за ўсё, народнае тлумачэнне навуковай назвы Млечны Шлях.

Неба старажытныя людзі лічылі цвёрдым крышталным купалам з дзіркамі (каб мог пралівацца дождж). Гэта прасочваецца ў шматлікіх беларускіх казках, дзе па велізарнай расліне (гароху), героі ўзбіраюцца на неба, ходзяць па ім, і там з імі адбываюцца розныя падзеі.

«Пасцялю дарожку, пасыплю гарошку, пакладу акраец хлеба»

Дакладных пацвярджэнняў таго, што ў нашых продкаў быў свой астралагічны задыяк, няма, аднак у музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах знаходзіцца чаша-карэц XVI стагоддзя, на вонкавым баку якой па перыметры акружнасці размешчана 12 малюнкаў — птушкі, звяры, людзі. Некаторыя навукоўцы трактуюць выявы на гэтым карцы як знакі задыяку, іншыя — як сімвалы 12 месяцаў года.

Астронімы (назвы бачных простым вокам астранамічных аб'ектаў), якія ўжываліся на нашай тэрыторыі ў XV—XVI стагоддзях і пазней, былі зафіксаваныя ў некаторых пісьмовых крыніцах, у тым ліку і ў «Бібліі» Францыска Скарыны. Больш ранніе ўсходнеславянскія назвы амаль не сустракаюцца, таму ўсе так званыя «старажытныя» астронімы — гэта толькі інтэрпрэтацыя навукоўцаў вусна-паэтычнай ці матэрыяльнай спадчыны.

Сведчаннем цікавасці старажытных «прабеларусаў» да нябеснай механікі з'яўляюцца і непісьмовыя матэрыяльныя крыніцы, якія дайшлі да нашых часоў. Адна з іх — беларускі «стоўнхендж» на возеры Янава на Полаччыне якому некалькі тысячагоддзяў. Састаўленыя ў пэўным парадку камяні ўяўляюць сабой старажытную абсерваторыю, дзе людзі маглі назіраць за нябеснымі аб'ектамі. Акрамя таго, на Беларусі знойдзены валуны са шматлікімі штучнымі паглыбленнямі, лункамі. Адназначнай упэўненасці ў іх прызначэнні няма, але некаторыя даследчыкі лічаць гэта вывявамі тагачасных сузор'яў, якія за тысячагоддзі змянілі свае абрысы і сёння выглядаюць інакш.

Рэха астранамічных ведаў нашых продкаў захавалася і ў народнай сімволіцы — у вопратцы, на прадметах побыту, у аздабленні хатаў. Кожны элемент арнаменту (сонца, зорка, месяц і інш.) меў сваё сакральнае значэнне і служыў абярэгам.

Магічную сілу зорак нашы продкі выкарыстоўвалі ў варажбе (на ручнік, дзе сімвалічна былі пазначаны сузор'і і вядомыя планеты, кідалі жменю зярнят і ў залежнасці ад таго, як ляглі зярняты, рабілі прадказанні), у замовах («Першым разам, вячэрнім часам небу пакланюся, зорам памалюся...», «Стану пад ясным небам, пад яснымі зорамі, перад дробнымі звяздамі, перад жаркім сонцам і ясным месяцам і нябеснаю калясніцаю...»).

— Значную ўвагу нашы продкі надавалі метэорам: «Паляцела зорка — трэба жаданне загадаць». Народнае тлумачэнне гэтай з'явы грунтуецца на хрысціянскіх вераваннях: зорка — гэта анёл. Ён ляціць па душу чалавека, які памірае, і падчас свайго палёту нікому ні ў чым не можа адмовіць, таму ў яго можна прасіць усё, што хочаш. Калі метэор прымалі за змея з золатам, маглі ў яго прасіць крышачку багацця. Згодна з іншай традыцыяй, калі ляцела зорка, дзяўчатам трэба было тузаць свае косы, тады валасы будуць такімі ж доўгімі, як палёт зоркі. А вось прыклад з любоўнай магіі: калі ляціць зорка, трэба завязаць вузельчык і назваць імя каханага... З дапамогай метэораў дзяўчаты варажылі на нарачонага (куды паляцела зорка — адтуль хлопца і чакай). Калі чалавек хацеў пазбавіцца ад бародаўкі, падчас падзення зоркі ён «страсаў» яе з рукі і казаў адпаведную замову.

З Сітам былі звязаны прыкметы, датычныя надвор'я. На веснавога Юр'я назіралі за Сітам, і ў залежнасці ад таго, яркія зоркі ці не, прадракалі, колькі будзе дажджлівых дзён.

Асноўны аб'ём інфармацыі пра народныя назвы касмічных аб'ектаў дае менавіта вусна-паэтычны пласт. Гэта песні, загадкі. «Пасцялю дарожку, пасыплю гарошку, пакладу акраец хлеба». (Дарожка — гэта Млечны Шлях ці неба ўвогуле, гарох — гэта зоркі, акраец — гэта месяц).

Даволі часта ў замовах і калыханках сустракаецца вобраз Трох Сясцёр, Трох Вядзьмарак (пояс Арыёна). Першапачаткова, у паганскія часы, гэта, хутчэй за ўсё, былі тры багіні, адказныя за лёс чалавека. У замовах сустракаюцца ўласныя імёны гэтых зорак: зорка Мар'я, зорка Дар'я, зорка Рына, Катарына, ці метафарычныя — запека, прылюба і г.д. Гэтым тром зоркам надавалі вялікае значэнне ўсе народы свету. Яны часта сустракаюцца ў розных арнаментах, песнях, варажбе. Пазней хрысціяне перайначылі іх у вобраз Трох Каралёў (валхвоў).

Легенды знікаюць, калі людзі імі не цікавяцца, — дадаў на заканчэнне Цімафей Авілін. — А калі ёсць інтарэс, гэтыя веды жывуць і развіваюцца. Напрыклад, адзін з інфармантаў патлумачыў, што плямы на Месяцы — гэта сляды гусеніц трактара, які туды неяк заехаў. Сёння многіх нашых суайчыннікаў вабіць самабытная гісторыя і культура Японіі, Егіпта, іншых далёкіх ад нас краін. А на сваё, роднае, яны не зважаюць. А калі людзі не бачаць унікальнасці ў сваёй культуры, яны і ў сабе яе не бачаць, губляюць сябе.

Інга МІНДАЛЁВА.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 32 (364)

Падаюць яблыкі — пара збіраць

Да ўборкі ўраджаю трэба падрыхтавацца загадзя: спыніць палівы дрэў, апрацоўку іх ядахімікатамі, скасіць траву ў садзе. Спецыялісты лічаць, што для ўмоў Беларусі, у прыватнасці, яе цэнтральнай часткі, прымальнай датай уборкі яблыкаў і груш з'яўляецца сярэдзіна верасня. У залежнасці ад хімічнага складу і прызначэння вызначаюць некалькі стадый спеласці пладоў: здымная, тэхнічная, спажывецкая, фізіялагічная.

У стане здымнай спеласці плады ўжо маюць неабходную колькасць пажыўных рэчываў, яны маюць здольнасць дыхаць і даспяваць, пасля таго як іх знімуць з дрэва. Менавіта такія плады найбольш прыгодныя для працяглага захоўвання.

Пры тэхнічнай спеласці плады маюць высокія тэхналагічныя якасці пры іх перапрацоўцы, здольнасць даспяваць і добра захоўвацца пры транспартаванні.

Спажывецкая спеласць характарызуецца максімальным накапленнем пажыўных рэчываў, наяўнасцю смаку, водару. У гэтым стане плады прыгодныя для неадкладнага ўжывання.

У поўнай фізіялагічнай спеласці ў пладоў спыняюцца любыя накапляльныя і біясінтэтычная працэсы, многія рэчывы пачынаюць распадацца, поўнасцю адсутнічае крухмал, мякаць робіцца рыхлай, губляецца смак. Звычайна плады даводзяць да такога стану, калі хочуць атрымаць насенне.

Позні збор пладоў немэтазгодны, бо пераспелыя плады няздольныя працягла захоўвацца, яны хутка губляюць свае пажыўныя рэчывы. Позні збор пладоў таксама аслабляе закладку кветкавых пупышак.

Для ўборкі пладоў трэба выбраць сухое надвор'е, калі з дрэў ападзе раса. Спачатку трэба сабраць апад, потым знімаюць плады з ніжніх ярусаў і паступова падымаюцца ўверх, даходзячы да верхняга яруса. Вельмі важна не адарваць пладаножку ад плода, не нанесці пладам механічных пашкоджанняў. Плод бяруць у далонь, абхопліваюць яго ўсімі пальцамі, указальным націскаюць на пладаножку ў месцы яе мацавання да пладовай галінкі. Нельга цягнуць плод уніз, адкручваць і тузаць, таму што пры гэтым можа абламацца пладаножка, пашкодзіцца скурка. Снятыя плады сартуюць і калібруюць па памеры, а затым асцярожна апускаюць у тару. Асабліва асцярожна трэба абыходзіцца са спелымі пладамі летніх гатункаў.

Разнастайнасць фарбаў у вяргінь

Вяргіні — самыя папулярныя асенніх кветкі. Па форме суквецця дзеляцца на некалькі груп: махровыя, паўмахровыя, кактусападобныя, хрызантэмападобныя, шарападобныя. Цвятуць гэтыя кветкі з ліпеня да самых замаразкаў.

Калі пачнуцца восеньскія пахаладанні, вяргіні можна акучыць сухой зямлёй на вышыню 15—20 см, дзякуючы чаму можна падоўжыць іх цвіценне яшчэ на 10—15 дзён.

Для зімовага захоўвання вяргіні лепш выкопваць прыблізна праз тыдзень пасля таго, як лісце пашкодзіць замаразак. Аматары кажуць, што нават пазней: трэба, каб лісты ўсе высахлі. Часам на глебе ўжо значныя замаразкі, але клубням гэта не павінна шкодзіць. Шматгадовыя назіранні паказваюць, што пакуль лісце не высахне, датуль у клубні пераходзіць шмат пажыўных рэчываў і добра закладваюцца маладыя пупышкі.

Ёсць некалькі спасабаў захоўвання клубняў вяргіні. Вы можаце выбраць той, які найбольш прымальны.

Пасля падмярзання наземнай часткі раслін трэба выкапаць кожны клубень з добрым камяком зямлі і паставіць шчыльна адзін да аднаго на стэлажы ў сухім падвале, які добра праветрываецца, дзе яны будуць захоўвацца да вясны. Можна выкапаныя клубні прасушыць да працягу дня на ветры, ачысціць ад лішняй зямлі і размясціць на паліцах або ў скрынях у падвале з тэмпературай паветра 3—8 градусаў і вільготнасцю 60—70 працэнтаў. Пры захоўванні ў скрынках клубні лепш перасыпаць пяском, торфам або пілавіннем хвойных парод.

Калі ў вас няма падвала або сховішча, клубні можна захоўваць і ў гаражской кватэры. Для гэтага іх трэба змясціць у скрынкі і паставіць у самае прахалоднае месца (напрыклад, побач з балконам) або расклас

Ёсць нагода

САМЫЯ ПРЫГОЖЫЯ ПАДЗЕІ І ЛЮДЗІ НА ДУМКУ БЕЛАРУСАЎ

9 верасня ў свеце адзначаюць Міжнародны дзень прыгажосці. Такая назва замацавалася за датай у 1995 годзе дзякуючы Міжнароднаму камітэту эстэтыкі і касметалогіі CIDESCO, які прапанаваў у гэты дзень усяму, што міла сэрцу і воку, надаць больш увагі, чым звычайна. Чаму? Бо заслугоўвае! Хоць бы таму, што суправаджае нас паўсюдна. Тая самая глабальная ПРЫГАЖОСЦЬ для кожнага чалавека выяўляецца ў нечым асабістым. А што было самай яскравай праявай прыгажосці ў вашым жыцці?

Дзіна ГРЫЦКЕВІЧ, студэнтка МДЛУ:

— У мяне ёсць адзін знаёмы, вельмі цудоўны і чулы чалавек. Ён мае невялікі даход, але гэта не перашкаджае яму займацца дабрачыннасцю. Праца, як і ў ва ўсіх, забірае шмат часу, а хлопец яшчэ і ў дзіцячы дом ідзе дапамагаць. Гэты чалавек ужо стаў для дзяцей сябрам: можа пагутарыць пра што заўгодна, парадаваць падарункам, развесяліць. Дзеці, зразумела, адкрыта рэагуюць на шчырыя эмоцыі. Па-мойму, вельмі прыгожа.

Аляксей ГРЫШЫН, алімпійскі чэмпіён па фрыстайле:

— Для мяне самае прыгожае — гэта калі мой любімы Мінск упрыгожваюць перад якім-небудзь святам. Асабліва перад новым годам, калі ўсе вуліцы і праспекты напоўненыя святлом. Да таго ж і людзі ў такія дні больш усміхаюцца, весяляцца.

Алена ЗУБІК, сімпатычная шатэнка:

— Успамінаю дзень, калі вянчалася сяброўка. Прыгожы храм, агеньчыкі лампадаў і свечак, убор святара і закаханыя маладыя. Усё разам так узрушыла. Было адчуванне сапраўднага хараства. А яшчэ я аднойчы позна вечарам вырашыла пакатацца на коле агляду. Асветлены горад унізе падаўся казачным.

Ігар БАРХАТКОЎ, мастак, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне»:

— Самым чыстым і прыгожым, што я бачыў у сваім жыцці, былі адносіны маіх бацькоў, іх душэўны лад. Ад іх ішла ўнутраная прыгажосць.

Алена ПЯТРОЎНА, настаўніца рускай мовы:

— У розныя перыяды жыцця я любавалася рознымі рэчамі. Напрыклад, салютам на святе ў горадзе, калі была студэнткай. Таксама аднойчы з захапленнем назірала, як аднаўляюць старадаўнюю архітэктуру. Адмысловае майстэрства: не нашкодзіўшы мінуламу, захаваць яго для будучыні. Цяпер у мяне ёсць дзіця. Думаю, у ім і яго з'яўленні на свет шмат прыгожага.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе:

— Найпрыгажэйшае здарэнне ў маім жыцці — сустрэча з маёй жонкай. Калі я ўбачыў яе, то падумаў: «Вось гэта самая прыгожая жанчына ў свеце». У тую хвіліну я параўнаў яе з Мадоннай. І вось неўзабаве ў нас будзе сярэбранае вяселле.

Віка ТРЭНАС, беларуская паэтка, рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць»:

— Аднойчы мы з сяброўкай наведалі Батанічны сад пасля рэканструкцыі. Гулялі ля вадаёма, глядзелі на лебедзяў. У нейкі момант злавіла сябе на думцы, што ўсё наўкол незвычайна прыгожа. А ўвогуле, для мяне заўжды прыгожы свет у сваёй разнастайнасці, таму імкнуся заўважаць хараство паўсюдна. У пейзажах, людзях, літаратуры, музыцы. Прыгожа, калі чалавек усё робіць з задавальненнем: працуе, апранаецца, ад гэтага жыццё становіцца лепшым і мы гарманічна сябе пачуваем.

Павел СЯРДЗЮК, святар:

— Я быў побач з жонкай, калі яна нараджала. Гэта найцудоўнейшы момант у маім жыцці. Няма нічога больш прыгожага за з'яўленне на свет новага чалавека.

Таццяна НІКІЦІНА, Міс БДУ-2010:

— Больш за ўсё мне падабаюцца маленькія дзеці. Я проста захапляюся імі. А ўвогуле, я нават не ведаю, як можна сказаць, што самае прыгожае ў нашым жыцці? Вось што больш прыгожае: зоркі ці мора? Ніхто не зможа адказаць. А калі чалавек закаханы, дык пачуццё хараства вельмі абвастраецца.

Ганна ГАРУСТОВІЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Сяргей НАГОРНЫ:

9 верасня — Міжнародны дзень прыгажосці

«Я вывеў формулу пераможцы конкурсаў прыгажосці»

Тыдзень моды ў Парыжы.

БЕЛАКУРАЯ мадэль з Аўстраліі на Тыдні моды ў Парыжы літаральна «ўзарвала» подыумы і сусветныя СМІ, стаўшы адзінай дзяўчынай, якая прыняла ўдзел адразу ў некалькіх мужчынскіх паказах запар. Але здзіўленню журналістаў не было межаў, калі яны даведаліся, што завуць дзяўчыну... Андрэй Педжыч і гэта — мужчына ад нараджэння...

18-гадовы эмігрант з былой Югаславіі вонкава амаль нічым не адрозніваецца ад дзяўчыны: хударлявыя ногі, жаноцкія рысы твару, доўгія валасы. Сяргей Нагорны, кіраўнік адной з найбольш аўтарытэтных студый моды ў Беларусі, назваў прыгажосць Педжыча тыпам «унісэкс».

Андрэй Педжыч — хлопец у стылі «унісэкс».

— На подыуме сёння запатрабаваныя вельмі маладыя хлопцы. Вобраз класічнай мужчынскай прыгажосці — містар свету — гэта камерцыйная рэкламная здымка. На подыуме — інакш, тут дамінуе стыль унісэкс. І поспех Андрэя Педжыча пра гэта гаворыць.

— Наколькі актуальны «унісэкс» для дзявочай моды?

— Прыгажосць можна ўмоўна падзяліць на два тыпы: класічная і подыумная. Яркі прыклад подыумнай прыгажосці — Кейт Мос. Заявіўшы пра сябе ў 1992 годзе, яна адправіла на пенсію Наомі Кэмпбел, Сіндзі Кроўфард і Клаўдзію Шыфер. Яе подыумны тыпаж расчараваецца і сёння: маладая дзяўчына 15-16 гадоў з анарэксічнай фігурай. Унісэкс: калі незразумела, дзяўчына перад табою ці хлопец. Такі стандарт прыгажосці для фотаіндустрыі актуальны і сёння. Беларускі прыклад — мадэль Кацярына Касушка, якая «стрэліла» сёлета на паказах у Нью-Ёрку.

— А як быць з прыгажосцю класічнай?

— Класічная прыгажосць — высокія скулы, натуральныя яркія вочы, галівудская ўсмешка, прапарцыянальны велічыні твару нос. Такая прыгажосць запатрабаваная падчас конкурсаў прыгажосці. Адзін з маіх любімых прыкладаў — вобраз Евы ў Сіксцінскай капэле. Гэты вобраз пераклікаецца з... Кацяй Даманьковай, нашай «Супермадэллю-2006». Яскравы прыклад класічнай прыгажосці. Мне ўвогуле здаецца, што я вывеў формулу для конкурсаў прыгажосці: каб даведацца пераможцу, трэба паспрабаваць праасацыяваць дзяўчыну з Евай. Калі вобразы супастаўляюцца — дзяўчыну можна спакойна выбіраць на першае месца.

— Якая прыгажосць у беларусак і ці дапамагае яна ім прабіцца?

«У МАДЭЛІНГУ Ў ВАС НІКОЛІ НЕ СПЫТАЮЦЬ ПРА ПАМЕР ГРУДЗЕЙ»

— Калі ў агенцтва тэлефануе дзяўчынка, якая хоча займацца ў подыум-школе — у яе ніколі не запытаюць пра памер грудзей. Усё, што важна на подыуме — гэта ўзрост (не больш за 18), сцёгны (не больш за 90) і рост (не ніжэйшы за 175 см). Памер сцёгнаў у залежнасці ад росту можа вагацца: 90-92. Жаночая фігура сышла з фэшн-індустрыі, забраўшы з сабою грудзі. Усё гэта пайшло ў «Плэйбой», конкурсы прыгажосці і камерцыйныя рэкламныя здымкі.

— Калі высокі рост — патрабаванне для подыумных мадэляў, то для конкурсаў прыгажосці высокі рост неабавязковы?

— Для конкурсаў прыгажосці можа быць зацверджаная дзяўчына і з меншым, чым у мадэлі, ростам.

РЭЗАЦЬ ЦІ НЕ РЭЗАЦЬ?

— Як у Еўропе ставяцца да мадэляў, якія карысталіся паслугамі пластычных хірургаў? На конкурсе «Міс Інтэркантынэнталь-2009» перамагла дзяўчына, якая некалькі разоў клалася пад нож...

— На мой погляд, такія дзяўчаты падыдуць толькі для конкурсаў прыгажосці. Фігура там сапраўды падводзіцца да ідэалу. Дзяўчаты на подыумах маладыя — 15-16 гадоў, а ў конкурсах прыгажосці — больш сталыя, там патрэбна жаноцкая фігура. Пластыка — ужо звычайная практыка для конкурсаў прыгажосці, але яна непрымальная для подыуму. На подыуме цэніцца прыродная прыгажосць. Але ж і табу на пластычныя аперацыі там няма. Заходніх мадэляў, якіх бяруць на паказы, не пытаюць, рабілі яны пластыку ці не. Зараз усё адбываецца праз інтэрнэт: глядзяць здымкі, просяць зрабіць відэа. Пасля агенты глядзяць, ці падыходзіць вобраз дзяўчыны для працы ў іх агенцтве.

«КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ — РЭЧ ПАЛІТЫЗАВАНАЯ»

— Даводзіцца чуць, што сёння ў Беларусі існуе моцная канкурэнцыя паміж мадэльнымі агенцтвамі. Наколькі гэта праўда?

— Мы шукаем новыя твары. Прыйшоў новы сезон, агенцтвы чакаюць для працы новыя цікавыя твары. З 1-га студзеня 2011 года будзе адменена ліцэнзія мадэльных агенцтваў. Цяпер барацьба будзе вельмі сур'ёзная, і канкурэнцыя павялічыцца. Але ў гэтым няма нічога дрэннага. Гэта будзе стымуляваць нас да новых праектаў і сур'ёзнай працы. Хоць ужо сёння ў кожнага з нас ёсць свая ніша: у Варламава — праца з маладымі дызайнерамі, у Нацыянальнай школы прыгажосці — конкурсы прыгажосці, у нас — больш подыумная праца, арыентацыя на Захад.

— Значыць, калі дзяўчына марыць перамагчы на конкурсе прыгажосці, яна павінна ісці толькі ў Нацыянальную школу прыгажосці?

— Неабавязкова. Мы таксама супрацоўнічаем з Нацыянальнай школай. І калі ў нас ёсць дзяўчына з цікавай знешнасцю, якая магла б «стрэліць» на конкурсе прыгажосці, мы раім яе Вользе Сярожнікавай.

— А якія крытэрыі падчас адбору на «Міс Беларусь»?

— Конкурс «Міс Беларусь» адкрыты для ўсіх дзяўчат. На конкурсе мы не спрабуем выбраць дзяўчыну з беларускай знешнасцю, а выбіраем дзяўчыну са знешнасцю еўрапейскай, каб яна ў далейшым змагла праславіць нашу краіну. Зразумела, тут павінен быць унутраны стрыжань: каб дзяўчыну заўважылі і яна стала фаварыткай. Конкурс прыгажосці, гэтаксама як і спорт, палітызаваны. За ўдзел плацяцца вялікія грошы і, зразумела, калі дзяўчына перамагае, яна праслаўляе сваю краіну, і конкурс нават можа прыехаць у Беларусь. Для маладой Беларусі імідж вельмі важны.

РЭАБІЛІТАЦЫЯ

Падводзячы вынікі, Сяргей Нагорны прызнаецца:

— Часам кажуць, што славянская прыгажосць губляе пазіцыі, уступаючы месца азіяцкай. Хачу супакоіць беларускіх дзяўчат і жанчын і параіць, каб яны не звужалі касметыкай вочы — кароткія ножкі моднымі не будуць. Славянская прыгажосць заўсёды была на п'едэстале: актуальная ва ўсе часы, яна і сёння дамінуе на подыуме.

Ілья ЛАПАТО.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.31	19.41	13.10
Віцебск —	6.19	19.33	13.14
Магілёў —	6.21	19.32	13.11
Гомель —	6.20	19.26	13.06
Гродна —	6.47	19.56	13.09
Брэст —	6.49	19.55	13.06

Месяц

Маладзік 8 верасня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Анфісы, Івана, Дзмітрыя, Пімена, Савы, Сцяпана.*

К. *Пятра, Сяргея, Якуба.*

Усміхнемся!

Жонка і муж:

— Я джынсы твае старыя суседу аддала...

— Чаго раптам?!

— Яны ўсё адно табе не падабаліся.

— Давай тады і маму тваю суседу аддамо.

☺

Толькі нашы жанчыны кахаюць вушамі, а ненавідзяць патэльняй.

☺

— Ася Маркаўна, што вы можаце сказаць пра свайго зяця?

— Ён зусім як самалёт — на зямлі ад яго аніякай карысці!

☺

Нават калі на НТБ збяруцца паставіць «Гамлета», дык ўсё адно пра міліцыю атрымаецца...

Дзеўкі, хутчэй! Жаніхоў усяго пяцёра!

☺

— Колькі гадоў вашай жонцы?

— Калі апошні раз пытаўся, было 27.

☺

Навукоўцы ўстанавілі, што самая зразумелая мова на Зямлі — кітайская. Яе разумее больш за 1,5 мільярда чалавек.

Падарожныя нататкі

У ЧЫМ РОЗНІЦА МІЖ БАРСЕЛОНАЙ І МІНСКАМ?

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА прыбыў у сталіцу іспанскай Каталоніі і даведаўся, што там можна з'есці за 9,95 еўра

ПАДАРОЖЖА ў Барселону пачалося для мяне ў Ашмянах. У аўтобус «Мінск — Каўнас» забегла рота цётачак-кантрабандыстак, якія пачалі ліханманкава распіхваць па шчылінах аўтобуса гарэлку і цыгарэты. Рэшту яны на прамілы Бог прасілі ўзяць астатніх пасажыраў (у дазволеных маштабах). Я такія рэчы не вельмі люблю, таму, калі дайшлі да мяне, зрабіў сур'ёзны выраз твару і адказаў: «Даруйце, мне нельга, я ў міліцыі раблю». Дзядзечка з дыяганальнага сядзення, які літасціва згадзіўся перавезці праз мяжу пляшку гарэлкі і пару пачкаў папяросаў, павярнуўся і з пагардай спытаў: «А што, калі ў міліцыі, дык не чалавек?!» Я зразумеў, што Барселона блізка.



Шырыня вулак у Еўропе заўжды здзіўляе нашага чалавека.

АШМЯНСКІЯ КАНТРАБАНДЫСТКІ СУПРАЦЬ ЛІТОЎСКІХ МЫТНІКАЎ

Мяжа Еўрасаюза, як вы здагадаліся, прыпала для мяне на пераезд Ашмяны — Вільня. Гэтыя памежнікі — адзіныя, хто будзе ставіць пячаткі ў пашпарт. Хіба толькі супрацоўнікі аэрапорта глянуць.

Спачатку ўсіх вытрасаюць з аўтобуса нашы — праходзьце праз залу і паказвайце пашпарты. Хіба да гэтага памежнага пункта яшчэ не дакаціўся цуд цывілізацыі — спецыяльныя ноўтбукі, якімі карыстаюцца памежнікі?.. Нашы, аднак, глядзяць хуценька, пасля пачынаецца цырк на літоўскай мяжы. Усіх таксама вытрасаюць, аднак узнікаюць прыгоды.

— Чаму так доўга?! — пішчыць з сярэдзіны чаргі дзяўчына на літоўскага памежніка. — У мяне, між іншым, у Вільні самалёт праз 3 гадзіны адпраўляецца, вы хочаце, каб я спазнілася?!

— У такім разе вы выбралі не той аўтобус!.. — з выглядам Джэймса Бонда адказвае ёй бялявы літоўскі памежнік у акулярах. — Нашы супрацоўнікі дэталёва правяраюць аўтобус на наяўнасць кантрабанды. І, ведаеце, небеспаспяхова.

Хвілін 20 ці больш усе проста стаяць на месцы ў чаканні сканчэння праверкі. Тым часам адна з «кантрабандыстак» паказвае ўнікальны нумар: скідвае лішнія пачкі цыгарэт у аранжавы пакет — і просіць мяне пакласці яго за дзвярыма, каб і адсюль, і з вуліцы не было відаць. Прайшоўшы мытню, яна выходзіць на двор і шпарка забірае тавар з-за дзвярэй. Трэба сказаць, нашыя «кантрабандысткі» пераплюнулі літоўскіх мытнікаў — тыя знайшлі далёка не ўсё. Аднак не будзем падстаўляць суайчыннікаў і выдаваць схованкі.

ШТО Ў ШАТЛАНДЦАЎ ПАД СПАДНІЦАЙ?

На квітку, які я раздрукаваў з камп'ютара, значыцца: «Каўнас — Барселона — Каўнас». Бо я не такі багаты, каб лётаць з Мінска. Вось параўнайце. Наколькі я ведаю, самы танны квіток Мінск — Барселона — Мінск каштуе 250 еўра (мне пра такі казалі, але сам я не знайшоў). Тое, што ўдалося знайсці адразу — 320 еўра ў адной авіякампаніі і 565 у іншай. Авіяквіток Каўнас — Барселона — Каўнас абышоўся прыкладна ў 140 еўра. Дабрацца да Каўнаса і назад — 124 тысячы. Агулам — 170 еўра. Эканомія — мінімум ад 80 да 425 еўра альбо ад 312 тысяч да 1 мільёна 657 тысяч 500 рублёў. Па-мойму, вартая таго, каб правесці пару гадзін у аўтобусе. Тым больш што, калі вы дасталі шэнгенскую візу, праблема здымаецца цалкам.

У Каўнасе (а беларускаму вуху чуецца: «ў Коўне») ад аўтавакзала да аэрапорта наўпрост давязе гарадскі аўтобус № 29. Квіток — 2 літы (каля 2250 рублёў). Аэрапорт утульны і хатні. Усё інтуітыўна зразумела — дзе здаваць багаж, дзе садзіцца на самалёт. Толькі піва дарагое — тое самае, што ў прывакзальнай краме ў Вільні стаяла за 3 літы (каля 6750), тут на разліў даюць за 7 (каля 15 750). І піва, скажу вам, так сабе — прыкладна як... Зрэшты, не будзем нарывацца на судовую позву ад аднаго мінскага піўзавода. У горадзе-герої за такія грошы можна на разліў выпіць сапраўднага ірландскага піва ды яшчэ рыбкі пажаваць у дадатак.

Тут табе ў аэрапорце — і апарат з кавай, і апарат з усякімі вафелькамі-шакаладкамі, і аўтаматычныя камп'ютары з інтэрнэтам. І нават калі ты раскладзеш на чамадане смажаную дома курыцу ў фользе і гурочкі-памідорчыкі — ніхто асабліва супраць не будзе.

Аднак якраз сёння літоўцы гулялі тут у футбол з шатландцамі. А шатландскія заўзятары — вам казаць не трэба — на ўсе матчы следам за сваімі кумірамі ездзяць у нацыянальным адзенні — кілтах. Ці, па-нашаму, мужчынскіх спадніцах. І вось завальваецца ва ўтульны аэрапорцік такіх фанатаў штук сто. Адзін кажа нешта кшталту:

— Мужыкі, а давайце ім пакажам нашы нацыянальныя танцы і спевы!..

З шатландскім заўзятарам у аэрапорце Каўнаса

І я адразу згадаў, як пару гадоў таму з шатландцамі гулялі нашы ў Мінску. І ў беларускіх дзяўчат быў шок, калі па праспекце Незалежнасці пачалі разгульваць прывабныя хлопцы ў спадніцах. Памятаю, дзяўчаты ўсё абмяркоўвалі, ці ёсць у тых хлопцаў што пад спадніцамі. І, магчыма, зусім не здагадваліся, што ў гэтым якраз і традыцыя — не надзяваць бялізну пад кілт. У Шатландыі нават перыядычна разгараюцца дэбаты на гэтую тэму. Напрыклад, адна кампанія, якая ўжо шмат гадоў здае кілты напракат, увяла строгае правіла: пад кілты надзяваць трусы. Альбо ты надзяваеш трусы — альбо не дамо табе кілта, і шукай дзе хочаш. Матываваліся тым, што гэтыя кілты не адмыць пасля. Аднак шатландцы запратэставалі: як так — традыцыя! Сябра Кансерватыўнай партыі Шатландыі Джэмі Макгрэгар сказаў проста: «Я лічу гэта поўнай лухтой. Таямніца таго, што ў свядомага шатландца знаходзіцца пад кілтам, з'яўляецца гэткай жа абавязковай часткай нашай культуры, як лахнэская пачвара. Новае правіла знішчыць усю рамантыку і містыку. Гэта немагчыма, яны не маюць права так паступіць».

Між іншым, калі пабачыце шатландца ў кілце, звярніце ўвагу на нейкія жалязякі на поясе. Існуюць розныя версіі, для чаго яны. Самая лагічная — каб спадніца не задзіралася ад ветру.

Але якая розніца, што ў іх там пад спадніцай? Шатландцы — вясёлы і добразычлівы народ. У 2 гадзіны ночы ў каўнаскім аэрапорце яны зладзілі цэлае шоу нацыянальнай музыкі, спеваў і танцаў. З завадатарам-валыншчыкам я не мог не сфоткацца. У якасці ганарара падараваў яму шакаладку «Алёнку». Той пры слове «Беларусь» ажывіўся і сказаў, што быў на тым матчы і вельмі ўпадабаў Мінск.

Тое, што ў марскім горадзе — звыклая справа, для беларуса — цікавостка.

ПРАВІНЦЫЙНЫ АЭРАПОРТ І 5,5 МІЛЬЁНА ПАСАЖЫРАЎ

Самалёт прылятае ў аэрапорт Жыроны, што за 92 кіламетры ад Барселоны. Ён такі ж утульны і маленькі, як у Каўнасе. Гэты аэрапорт часта выкарыстоўваецца як альтэрнатыва аэрапорту Барселоны — бо сюды лётаюць танныя авіякампаніі. Аэрапорт быў збудаваны ў 1965 годзе, аднак доўгі час не карыстаўся вялікай папулярнасцю. І толькі на пачатку 2000-га, калі адна з танных авіякампаній выбрала гэты аэрапорт сваім «хабам» (перасадкавым цэнтрам), пасажырапаток узрос у 10 разоў — з 557 тысяч пасажыраў у 2002 годзе да 5,5 мільёна пасажыраў за 2008 год. І гэта — правінцыйны аэрапорт (у Жыроне жыве 94 тысячы чалавек, гэта менш, чым у Маладзечне). Для параўнання — за 2008 год наш нацыянальны аэрапорт «Мінск-2» прыняў 1 мільён 10 тысяч пасажыраў...

Пашпарты ў Барселоне не глядзяць — Еўрасаюз. Ад аэрапорта да Барселоны дабрацца каштуе 12 еўра, туды-назад 21. Дорага, але іншага выйсця няма. Гадзіна дзесяць ва ўтульным аўтобусе — і вось яна, Барселона!..

ДЫК У ЧЫМ РОЗНІЦА МІЖ МІНСКАМ І БАРСЕЛОНАЙ?

Калі коратка — у 13 градусах. 7 верасня а 15.00 у горадзе-герої было +15 градусаў, у Барселоне — +28. У моры, здаецца, столькі ж.

— Гэй, вам памагчы?.. — шчыра ўсміхаецца прадавец бутэрбродаў у метро, пабачыўшы разгубленых беларусаў з валізамі. — Магчыма, вы шукаеце гатэль, дык гэта да канца перахода і налева!..

Тут разумееш, што Бог, відаць, гартуе беларусаў нашым кліматам. Як кажуць, пад прыгнётам мужнее нацыя. Колькі б пратрываў тутэйшы абарыген каля Нацыянальнай бібліятэкі, калі ў яго родным горадзе нават зімой не бывае халадней за +10?..

Гэта неістотна: беларус гатовы трываць тут даволі доўга. У маім выпадку — тыдзень. Перад паездкай усе навыперадкі папярэджвалі (і хто быў тут, і хто не быў): сцеражыся, горад вельмі дарагі! Аднак, як паказвае практыка, калі падыходзіць да гэтых пытанняў рацыянальна, можна харчавацца за прымальныя грошы ў любым горадзе любой краіны.

Варыянт першы — супермаркеты. Кілаграм бананаў — 2600 на нашы грошы, два літры соку — 4800, невялікая дыня — 3900, каўбаса прадаецца нарэзанымі кавалкамі ва ўпакоўках па 1-2 еўра. На раз паесці хапае.

Іншы варыянт — кавярні. Бадай, самы танны варыянт — шукаць кавярню з так званым салат-барам. Гэта калі бярэш усяго колькі хочаш (па прынцыпе шведскага стала) і плоціш фіксаваную суму. Я знайшоў такую ў самым цэнтры. Кошт — 9,95 еўра (38 800). Аднак за гэтыя грошы можна так налупіцца ад пуза, што хопіць на цэлы дзень! Прычым, заплаціўшы гэтую «стаўку», можна падыходзіць да стойкі з ежай зноў і зноў. А там — розная гародніна, супчык-гаспача з памідораў, макарона, бульба, каўбаса, рыбныя палачкі, піца, салацікі. Плюс напоі — пэпсі, кава-гарбата і нават піва. Пі, еш — колькі хочаш. Шкада, як кажуць, што на тры дні наперад не наясіся.

Гатэльчык, дзе ўдалося спыніцца (загадзя зарэзерваваўшы месца праз інтэрнэт) — тыповы еўрапейскі хостэл. Гэта значыць — без вялікіх выгодаў (душ на калідоры), затое танна і дэмакратычна. У пакоях — ад двух да 12 чалавек, кошт змяняецца прапарцыйна. Скажам, месца ў пакоі на дванаццаць чалавек каштуе 17 еўра, у пакоі на чатырох — 21 еўра, а ў пакоі на дваіх (гэта самае дарагое) — 29 еўра. У хостэле — дармовы інтэрнэт і камп'ютары, кухня (пліта, мікрахвалёўка, тостар, чайнік, лядоўня), пральная машына... У кожным пакоі — кандыцыянер і прыбіральня. Знаходзіцца хостэл каля самага выхаду з метро, да мора — шэсць хвілін пехам.

На пляжы аншлагу не назіраецца. Напэўна, асноўны сезон ужо скончыўся. Незразумела, чаму. Горача. Мора цёплае. Сонца паліць — можна з бледнай спірахеты за два дні зрабіцца, як шакаладка.

Пайду рабіцца.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.
(Працяг будзе.)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4406 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12